Невінаваты ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960 NR INDEKSU 366714

Госці на судзе ☞ 3

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 22 (2611) Год LI Беласток, 28 мая 2006 г. Цана 2,00 зл. (VAT 0%)

МЫ НЕВІНАВАТЫЯ !!!

Фота РАІНЫ СТЭФАНЧУК

Суддзя Кшыштаф Казлоўскі адчытвае прысуд

Гэты працэс быў непатрэбны. Выйграла дэмакратыя, справядлівасць і здаровы розум. Суд паказаў, што ён — незалежны, — такія каментарыі абвінавачаных і наглядальнікаў прагучалі пасля абвяшчэння рашэння III Крымінальнага аддзела Раённага суда ў Беластоку ў г.зв. справе „Нівы". Прыгавор суд вынес 16 мая, у чарговы „Дзень Салідарнасці з Беларуссю", які кожны месяц праводзіцца ў Польшчы.

На лаве абвінавачаных заселі 11 членаў Праграмнай рады нашага тыднёвіка. Галоўныя абвінавачаныя: тагачасны яе шэф Яўген Мірановіч і бухгалтарка Марыя Паўлючук ды Юры Шульскі, Пятро Юшчук, Міраслава Лукша, Яўген Вапа, Юры Каліна, Юры Хмялеўскі, Алена Глагоўская, Міхал Стэльмашук і Міхал Андрасюк. У пракуратуру, а затым у суд заява на пакаранне трапіла пасля кантролю Найвышэйшай кантрольнай палаты, якая сцвердзіла, што ад 2001 г. да канца сакавіка 2003 г. дайшло да шэрагу фінансава-рахункаводчых няправільнасцей ды несумленных разлікаў датацый і ўпісвання неадпаведных інфармацый пры стараннях за іх. На думку пракуратуры, неналежныя датацыі сягалі больш за 99 тысяч злотых. Пракуратура хацела пакараць Яўгена Мірановіча 8 месяцамі турмы з адтэрміноўкай на 2 гады і штрафам у 2,1 тыс. зл., а глаўбуха на год турмы з адтэрміноўкай на тры гады і 3 тыс. злотых штрафу. У дачыненні да астатніх абвінавачаных пракуратурай прапанавалася спыненне справы з адтэрміноўкай на год і па 500 зл. штрафу кожнаму. Дзевяць абвінавачаных спынення справы не хацелі і рашылася даказаць сваю невіноўнасць перад судом.

На абвяшчэнні прысуду з'явіўся тлум наглядальнікаў, які бітком набіўся ў судовую залу. Сярод іх былі лідэр беларускай апазіцыі Аляксандр Мілінкевіч з жонкай. Былы кандыдат на прэзідэнта Беларусі перад апошняй справай казаў:

— Я прыехаў, каб падтрымаць калегаў беларусаў. Ведаю, што іх сітуацыя цяжкая. „Ніва" магла б увогуле перастаць выходзіць.

На судовай зале можна было прыкмеціць прадстаўнікоў беларускіх незалежных няўрадавых арганізацый: „Бацькаўшчыны" ці „Вясны". Былі таксама дэпутат Роберт Тышкевіч — старшыня парламенцкага калектыву па справах Беларусі, Марыюш Машкевіч — былы пасол РП у Мінску, нядаўні вязень у Беларусі і шмат сяброў „Нівы" з абодвух бакоў мяжы.

Суддзя Кшыштаф Казлоўскі доўга зачытваў абвінаваўчы акт. Пасля яго слоў: „апраўдваю" і — у выпадку некаторых абвінавачанняў у адрас Яўгена Мірановіча і ўсіх абвінавачанняў у адрас Марыі Паўлючук — „спыняю", прагучалі гарачыя апладысменты. Суддзя абгрунтоўваў:

— Калі б гаварыць аб наўмыснай віне, трэба было б даказаць, што абвінавачаныя мелі веды, што ёсць нейкія няправільнасці ў вядзенні рахункаводчых кніг і прынамсі пагаджаліся на такую сітуацыю. У гэтай сферы, аднак, няма на гэта ніякіх доказаў.

Паказаў:

— Трэба звярнуць увагу на тое, кім з'яўляюцца абвінавачаныя. Гэта асобы з гуманітарнай адукацыяй, галоўным чынам журналісты, якія аб вядзенні рахункаводчых кніг не маюць ніякіх ведаў. (...) Абвінавачаныя не мелі ніякай рацыянальнай прычыны, каб змяшчаць у кнігах і фінансавых справаздачах сумніўныя інфармацыі. Усе няпра-

[працяг ☞ 3]

Краявід пасля бітвы ☞ 2

Яўген МІРАНОВІЧ

Нягледзячы на вынік судовага працэсу, разгром беларускага руху стаў фактам. Людзі сапраўды сталі баяцца, што за само членства ў беларускай арганізацыі могуць судзіць. Раптоўна паменшала колькасць ахвотных удзельнічаць у якой-небудзь беларускай акцыі. Людзі адчулі, што бесперашкодна можна яшчэ толькі займацца фальклорам, спяваць бытавыя песні прыгонных прадзедаў, а нават сучаснае дыска-пола, што нацыя атрымала дазвол паміраць з песняй...

Катлы з удавіцамі ☞ 4

Аляксей МАРОЗ

З кожным годам старэюцца Катлы. У распаложанай побач Бельска-Падляшскага вёсцы жыве ажно 24 удавіцы і 2 удаўцоў, а толькі адно дзіця дабіраецца на гмінным аўтобусе ў школу. Вузкая вуліца і невялікія драўляныя хаткі паабапал дарогі ствараюць добрую нагоду вяртацца думкамі ў мінулае...

Агляд у Гарадку ☞ 5

Міхась ХМЯЛЕЎСКІ

13 гадоў таму ГП БГКТ увяло ў план сваёй штогадовай дзейнасці Агляд абрадавых калектываў як адно з мерапрыемстваў звязаных з тоеснасцю беларусаў Беласточчыны, з іх рэлігіяй, традыцыяй і прыгожымі звычаямі. Ужо ад дзесяці гадоў праводзіцца яно ў Гарадку...

Па слядах Чэслава Мілаша ☞ 9

Ганна КАНДРАЦЮК

У Каўнасе мы, дарэчы, ужо традыцыйна, заблудзілі. Чамусьці замест на лакальную дарогу, якая ідзе паўз берага Нёмана, мы папалі на аўтастраду, проста ў Клайпеду. Такі паварот справы зусім не суцяшаў — наадварот. Паколькі ўжо трэці раз мы з'ехалі не там дзе трэба і перад намі слалася самая камфортная і бясплатная аўтастрада ў Літве, што набліжала нас да мэты, мы пачалі роздумы над логікай пэўных памылак...

1848 год: „Касцюшка ў Крынках!" ☞ I

Алесь ЧОБАТ

У лютым 1848 года грымнула чарговая рэвалюцыя ў Парыжы і пачалася Wiosna Ludów, а ўжо ў пачатку красавіка да ўправы рускай паліцыі ў Беластоку прыляцеў конна карчмар з Крынак, Моўша Вольфавіч Герц, з даносам, што туды прыбыў „важны человек Костюк или Костюшко" і пахваляецца спаліць панскі двор палкоўніка Аляксандра фон Ліпхарта...

Добрыя тэндэнцыі

Выйшаўшы з будынка Беластоцкага суда, дзе толькі што былі апраўданы сябры Управы Праграмнай рады тыднёвіка „Ніва", да мяне даляцелі словы аднаго з прысутных на судовай зале. Ён з радасцю абвясціў, што, нарэшце, заангажаваных у беларускіх справах беларусаў, якія ўсё жыццё прысвяцілі беларускасці, апраўдалі, а не пакаралі. І гэта, маўляў, першы выпадак за яго жыццё. На гэта другі прысутны заўважыў, што гэта ўвогуле можа быць першы выпадак за ўсю навейшую гісторыю. Нехта нагадаў, што нешта падобнае ўжо было. Нядаўна ў Мінску суд апраўдаў Станіслава Шушкевіча, былога спікера беларускага парламента і сённяшняга актыўнага палітычнага дзеяча аб'яднанай беларускай апазіцыі. Усе прысутныя весела і задаволена назвалі апошнія падзеі добрымі тэндэнцыямі і пажадалі адзін аднаму, каб урэшце апраўданне беларусаў за беларускія справы перарасло ў традыцыю. А лепш, каб увогуле за гэта не судзілі. Бо так ніхто толкам і не змог растлумачыць, ні на судзе, ні да яго, у чым жа вінавацілі тых „ніўцаў".

Таму і было так трывожна на душы да суда, што ніхто не ведаў, чым можа закончыцца справа, сутнасць якой па-ранейшаму застаецца незразумелай для тых людзей, якія не знаёмыя з адмысловымі юрыдычнымі кручкамі, якімі можна падчапіць каго хочаш і за што хочаш. Але, здаецца, тыя часы, калі беларусы проста бяздзейсна перажывалі і непакоіліся адзін за аднаго, не пакідаючы сваёй хаты, пачынаюць адыходзіць у мінулае. Беларусы пачынаюць падтрымліваць сваіх суродзічаў актыўна. І гэта яшчэ адна добрая тэндэнцыя. Справа „ніўцаў" абудзіла беларусаў па ўсім свеце. І зараз, на заключнае судовае пасяджэнне прыйшлі не толькі абвінавачаныя і іх адвакаты, але, што самае найважнейшае, прыехалі беларусы з Беларусі. Прадстаўнікі журналістыкі і палітычныя дзеячы, сябры няўрадавых арганізацый і праваабаронцы, дзеячы беларускіх сусветных згуртаванняў і проста беларусы прыехалі ў Беласток, каб сваім візітам паказаць „ніўцам", што яны ў гэты момант будуць разам з імі, што яны ведаюць гэтых беларускіх дзеячаў у Польшчы як сумленных і чэсных людзей, якімі ўжо ганарыцца наша нацыя, і што падтрымліваць іх гэта не толькі справа гонару для кожнага свядомага беларуса, але і гонар быць разам. І хоць на Беларусі іх саміх хапаюць і садзяць, праводзяць ператрусы і штрафуюць, яны ўжо паводзяць сябе як гаспадары на сваёй зямлі, як прадстаўнікі нацыі, якой неабыякавы лёс кожнага беларуса, незалежна ад таго дзе ён жыве. Тым больш лёс тых прадстаўнікоў нашай нацыі, дзейнасць усяго жыцця якіх была скіраваная на адраджэнне і росквіт беларускасці.

Асаблівай увагі заслугоўвае прыезд у гэты дзень Аляксандра Мілінкевіча — лідэра беларускай аб'яднанай апазіцыі, кандыдата на галоўную пасаду краіны на мінулых выбарах. Спадар Мілінкевіч сам толькі што выйшаў з астрога, згубіўшы не па сваёй волі пятнаццаць сутак. Гэтае пакаранне за правядзенне ў сталіцы Беларусі публічнай масавай акцыі, прысвечанай чарговай сумнай гадавіне аварыі на Чарнобыльскай атамнай станцыі, на паўмесяца пазбавіла яго мажлівасці актыўнай палітычнай дзейнасці. Але ў сваім насычаным працоўным графіку знайшоў ён час для паездкі ў Беласток, паказаўшы тым самым, што яго цікавяць як палітычныя змены і рэформы ў самой Рэспубліцы Беларусь, чаму прысвечана яго асноўная дзейнасць, так і ўсе справы, якія тычацца беларусаў, дзе б яны не адбываліся. І гэта яшчэ адна добрая тэндэнцыя. Яна сведчыць і пра тое, што палітычны дзеяч, які змагаўся за вышэйшую пасаду ў Беларусі, працягвае сваю палітычную дзейнасць, і пра спеласць нашай нацыі, і пра ўзрастаючую салідарнасць беларусаў.

Справа закончылася перамогай. І можна з тае нагоды шмат напісаць. Многа каму выказаць падзяку, успомніць нядаўна памерлага Зміцера Кіселя, які першы з беларускіх журналістаў пачаў асвятляць гэтую тэму, узгадаць Марціна Рэмбача, які першы выказаўся ў друку ў падтрымку „ніўцаў" папольску і закончыць Беластоцкім судом, якому падзяку за справядлівы вырак выказалі апладысментамі ўсе прысутныя на заключным пасяджэнні. І яшчэ хочацца проста павіншаваць „ніўцаў" з перамогай і пажадаць поспехаў у іх важнай і неабходнай дзейнасці, скіраванай на адраджэнне і росквіт беларускасці. Бо ў тых добрых тэндэнцыях, якія нарэшце сталі памнажацца, ёсць таксама і вялікі кавалак іх пяцідзесяцігадовай штодзённай працы.

Віктар САЗОНАЎ

Краявід пасля бітвы

Пасля аб'яўлення рашэння суда ў справе „Нівы" госці з праваабарончых арганізацый Беларусі амаль аднагалосна пракаментавалі: „Гэта быў першы палітычны працэс, у якім апраўдалі беларусаў". Сапраўды, гэта быў нейкі пераломны момант. Я чакаў такога завяршэння працэсу, але на вышэйшым узроўні, магчыма нават перад еўрапейскім судом. Суддзя, які разглядаў гэтую справу, Кшыштаф Казлоўскі, гэта чалавек даволі малады. Я баяўся, што не стрымае ён ціску трохгадовай брутальнай прапаганды супраць беларускай інтэлігенцыі з боку мясцовых газет, дзяржаўнага тэлебачання і радыёвяшчання, дзе загадзя прызналі нас вінаватымі ў шматлікіх злачынствах.

Хаця антыбеларуская прапаганда інспіравалася кіраўніцтвам Беластоцкай дэлегатуры Найвышэйшай кантрольнай палаты і пракуратуры, аднак узровень заангажавання паасобных рэдакцый у кампраметаванні беларускага выдання быў нечаканы. Хлусня, якая паўтаралася дзесяткі разоў, у выніку гэтай прапагандысцкай кампаніі ў свядомасці грамадства ставалася аб'ектыўнай праўдай. Мясцовая прапаганда, пакуль пачаўся працэс, асудзіла нас і прызнала вінаватымі. Газеты і тэлебачанне пераўтварыліся ў бюлетэні пракуратуры. Бывала, што адна з газет друкавала ў адным нумары па 3 артыкулы, у якіх пашыраўся лік нашых злачынстваў. Выглядала на тое, што выдаўцы „Нівы" стваралі большую небяспеку дзяржаве і грамадству, чым славутая мафія з Прушкова.

Шэф Беластоцкай раённай пракуратуры Бажэна Кішло, не чытаючы ніякіх дакументаў, зусім не ведаючы справы, крычала ў масмедыях, што выдаўцоў „Нівы" можна пасадзіць у турму нават на 8 гадоў. Паліцыя шалела. Па загаду пракуратуры абыходзілася з намі так як з забойцамі, хаця ніводзін паліцыянт не ведаў, якое злачынства мы ўчынілі.

Мінулыя тры гады я часта задумоўваўся, што прымушала кіраўніцтва Найвышэйшай кантрольнай палаты і пракуратуры выкарыстоўваць дзяржаўныя ўстановы і найбольш нікчэмныя метады для змагання з невялікай групай беларускай інтэлігенцыі, прадстаўляючай у сапраўднасці хутка знікаючую апошнюю нацыянальную меншасць у Польшчы. Знаходзіў я толькі тры варыянты адказу — шавінізм самых чыноўнікаў і пракурораў, спадзяванне павышэння па службе і выкананне палітычных заказаў. Калі выступаў апошні варыянт, раней, ці пазней атрымаем адказ, хто і па якіх прычынах жадаў разгрому беларускага руху.

Нягледзячы на вынік судовага працэсу, разгром беларускага руху стаў фактам. Людзі сапраўды сталі баяцца, што за само членства ў беларускай арганізацыі могуць судзіць. Раптоўна паменшала колькасць ахвотных удзельнічаць у якойнебудзь беларускай акцыі. Людзі адчулі, што бесперашкодна можна яшчэ толькі займацца фальклорам, спяваць бытавыя песні прыгонных прадзедаў, а нават сучаснае дыска-пола, што нацыя атрымала дазвол паміраць з песняй.

Падчас гэтых апошніх трох гадоў аказалася колькі маем сапраўдных сяброў у Польшчы. Маем іх, але няшмат. Большасць тых, якія прыкідваліся нашымі сябрамі, тры гады таму парвалі ўсе кантакты. Адазваліся на другі дзень пасля судовага рашэння. Усё адбылося згодна з савецкай нормай.

Станоўчае было тое, што ўпершыню паказалася беларуская салідарнасць. Словы падтрымкі плылі з усіх куткоў свету. На гэты час, за адным выключэннем, сваю ціхую вайну супраць асяроддзя „Нівы" стрымалі ўсе беларускія дзеячы, якія былі з намі ў ідэйным канфлікце. Шмат хто звяртаўся з пытаннем, у які спосаб можна дапамагчы. Сакрат Яновіч ва ўсіх масмедыях працэс супраць „Нівы" рашуча называў „чорным кабарэ". Апрача дэмакратычных палітыкаў і дзеячаў з Беларусі, быў з намі таксама першы старшыня Саюза палякаў Беларусі Тадэвуш Гавін, які не скрываў свайго расчаравання тым, што ў нас адбывалася.

На канец хачу павіншаваць калегаў па Праграмнай радзе, сябраў па лаве абвінавачаных за тое, што з годнасцю прайшлі гэтае выпрабаванне. У нашай традыцыі часцей можна было сустрэць адваротныя прыклады. Варта прыгадаць, што ніхто з дзевяці сябраў Рады, якім прапанавалася заплаціць штраф і ўмоўна спыніць далейшы працэс супраць іх, не прыняў гэтай крывадушнай прапановы пракуратуры. Амаль усе гатовыя былі да канца змагацца за свой гонар і праўду. Падчас гэтага крызісу празрыста было відаць хто ёсць хто, так сярод нас — членаў Праграмнай рады, сярод беларускіх дзеячаў Беласточчыны, польскіх палітыкаў і журналістаў, як усіх тых, якія раней прыкідваліся прыхільнікамі беларусаў.

Яўген МІРАНОВІЧ

Вачыма еўрапейца

Пытальнікі засталіся

Пасля абвяшчэння прыгавору ў справе „Нівы" ўсе зацікаўленыя аддыхнуліся з палёгкай. Усе, можа апрача, — як гэта назваў старшыня судзейскага складу, — пракурора і непрыхільных асоб, якім залежала на тым, каб зрабіць членаў цяпер ужо былой Праграмнай рады газеты злачынцамі. Пасля апошняга працэсу размаўляў я з некалькімі асобамі, якія ў знак салідарнасці паявіліся ў судзе. Сярод іх быў лідэр беларускай апазіцыі. Пасля выхаду з судовай залы сказаў ён:

— Калі вяртаюся з Польшчы, нашы пагранічнікі распытваюць у мяне, ці я выпадкова не перавожу „Ніву". Я веры у справядлівасць суда і лічу прысуд справядлівым. Дэпутат Роберт Тышкевіч, старшыня парламенцкага калектыву па справах Беларусі ці былы пасол РП у Мінску Марыюш Машкевіч ды шмат іншых наглядальнікаў лічаць, што справа супраць членаў Праграмнай рады нікому не была патрэбная, што гэта была звышстараннасць НКП і пракуратуры.

— Як слушна заўважыў суд, былі асобы, якім залежала на тым, каб паставіць „Ніву" перад судом, — згодна заявілі дэпутат Роберт Тышкевіч і, напрыклад, старшыня Беларускага дэмакратычнага аб'яднання Яўген Янчук.

Дзень пасля прысуду скантактаваўся я з Антоні Янухтам, які кіраваў быў Беластоцкай дэлегатурай НКП у час кантролю „Нівы". Аказалася, што ён увесь час падтрымлівае сваю пазіцыю:

— Здараліся ж памылкі. Не хапіла мне з боку „Нівы" таго, каб прызналася да віны. Былі напругі, але не было абмену думкамі. Зверху было прынята як бясспрэчны факт, што НКП, Янухта — палітычна інспіраваныя. Гэта не я даў пасля кантрою ў „Ніве" інфармацыю для прэсы. Магу меркаваць, якімі дарогамі прэсавыя публікацыі пайшлі ў сенсацыйнай форме. Хтосьці хацеў, каб так было.

І дадаў:

— Магу павіншаваць вас, што ўсё так добра закончылася.

Антоні Янухта не хацеў сказаць, хто гэта такі той „хтосьці". Першы да матэрыялаў з кантролю НКП „дайшоў" Збігнеў Нікітаровіч і гэта ён і яго рэдакцыя раскідваліся акрэсленнямі, якія загадзя асуджвалі „Ніву". Пасля прысуду ў размове са мной рэдактар Нікітаровіч непахісна тлумачыў:

— Суд справіўся належна. Не прыкмячаю ў гэтай справе ніякага палітычнага сэнсу, апрача таго, што надалі яму такую афарбоўку беларускія асяроддзі і яны зрабілі з гэтага афёру. Я захаваў усе журналісцкія прынцыпы. Я ніколі не адчуваў сябе бокам у гэтай справе, хоць прыпісваліся мне цёмныя намеры.

Засланяючыся журналісцкай тайнай, Нікітаровіч не хацеў выявіць, якімі дарогамі дайшло да публікацыі, да таго яшчэ да падачы заявы НПК у пракуратуру, якая пасля на этапе збірання доказных матэрыялаў карысталася перш за ўсё ягоным першым артыкулам «Przeminęło z „Niwą"». Варта тут прыгадаць канец таго тэксту: „Мы неафіцыйна даведаліся, што НКП на пачатку жніўня намерваецца падаць у пракуратуру паведамленне ў справе фальшавання дакументаў".

Мабыць, з часам акажацца, як гэта сталася, што мусіла дайсці да працэсу „Нівы". Яўген Мірановіч, старшыня Праграмнай рады ў „тыя" 2001-2003 гады заявіў пасля прысуду СМІ:

— Гэта быў прысуд адзіны з магчымых. Суд паказў, што ён незалежны. Не было ніякага злачынства, хоць тры гады праследавалі мяне пракуратура і масмедыі. Я хацеў бы ведаць, якімі матывамі кіраваліся НКП і пракуратура.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Фота РАІНЫ СТЭФАНЧУК

МЫ НЕВІНАВАТЫЯ !!!

вільнасці, якія сцвердзіла НКП, а затым судовая кансультантка, былі вынікам недастатковай кампетэнтнасці абвінавачанай Марыі Паўлючук, ды нельга за іх абвінавачваць членаў управы Рады.

Прытым суддзя Казлоўскі падкрэсліў, што памылкі бухгалтаркі „мелі школьны характар". Дадаў прытым, што ў дакументах былі несумленныя інфармацыі аб тыражу і гэта не было памылкай. Было гэта аднак неабходнае для таго, каб старацца за датацыі.

— Перш за ўсё трэба падкрэсліць адно, што падаванне ў заявах абвінавачанымі несумленных даных не мела большага і вырашальнага ўплыву на сумы назначаных датацый.

Сканстатаваў пры гэтай нагодзе:

— Можна рызыкнуць сцвярджэнне, што калі б абвінавачаны Мірановіч хацеў дакладна разлічыцца з усіх вызначэнняў змешчаных у дамовах, то „Ніва" не паказвалася б у сваёй форме і перыядычнасці.

Адзначыў таксама рашуча:

— Хоць фармальна былі парушаны вызначэнні падпісаных дамоў, дык ні адна залатоўка з сумы пералічанай у абвінавачаннях не была выдадзеная на іншую мэту, чым шырока разуметая падтрымка дзейнасці беларускай меншасці. Няма сумненняў, што прадстаўнікі гэтай меншасці найлепш ведаюць, як падтрымліваць уласную культуру і ў які спосаб выдаваць прызначаныя на гэтую мэту сродкі. Цяжка таму тут гаварыць аб узнікненні якой-небудзь шкоды. Найбольш лічацца мерытарычныя крытэрыі, а міністэрства высока ацаніла ўзровень тыднёвіка, што, без сумненняў, з'яўляецца заслугай абвінавачаных.

У завяршальнай частцы абгрунтавання суддзя сцвердзіў, што ні адна з устаноў, якая была донарам дзейнасці Праграмнай рады, не патрабавала вяртання грошай і нельга мець засцярогі наконт рэалізацыі мерытарычных заданняў, а практыка ў „Ніве" ў гэтым сэнсе не адрознівалася ад падобнай у іншых арганізацыях.

— Відавочна, па-за пракурорам і можа асобамі непрыхільнымі абвінавачаным ніхто не зацікаўлены пакараннем Яўгена Мірановіча і Марыі Паўлючук.

Гэтае сцвярджэнне публіка ўспрыняла чарговымі апладысментамі і гучным смехам.

Коштамі працэсу суд абцяжарыў Дзяржаўны скарб. Прыгавор яшчэ неправамоцны. На працягу сямі дзён ад вынясення судовага рашэння пракуратура можа падаць апеляцыю. Пасля прыгавору, у размове з „Нівай", пракурор Артур Штахельскі, які прадстаўляў абвінаваўцу (Пракуратуру Беласток-Поўдзень) заявіў:

— Не хачу каменціраваць прысуд. Пракуратура пачакае пісьмовага абгрунтавання. Пабачым, як аднесціся да пытання кожнага з абвінавачанняў.

Раіна СТЭФАНЧУК

Па дарозе да працэсу

Гэтак званая „справа *Нівы*" цягнулася тры гады. Калі пракуратура падасць апеляцыю, працягнецца яшчэ даўжэй. Выклікала яна шмат эмоцый. Вось у фактаграфічным скарачэнні храналогія падзей, якія давялі да працэсу, завершанага апраўданнем і спыненнем.

5 мая — 17 кастрычніка 2003 г. — Найвышэйшая кантрольная палата правяла кантроль „Выкарыстанне публічных сродкаў у галіне культуры суб'ектамі не прылічанымі да сектара публічных фінансаў". Даследаванні датычылі перыяду 2001-2003 гг. (I квартал). Скантраляваны былі 135 суб'ектаў ва ўсёй краіне, у іх ліку вызначаная беластоцкай дэлегатурай „Ніва". У агульным падвядзенні вынікаў кантролю ад сакавіка 2004 г. цэнтральнае кіраўніцтва НКП сцвердзіла: „Палата ў сувязі з выяўленымі істотнымі няправільнасцямі, адмоўна ацэньвае назначанне і разлік мэтавых датацый, якія перадаваліся міністрам культуры суб'ектам не прылічаным да сектара публічных фінансаў". Пазнейшыя заявы ў пракуратуры НКП накіравала выключна на ўстановы, якія можна пералічыць на пальцах адной рукі, сярод іх — і на „Ніву".

7 ліпеня 2003 г. — пасля кантролю ў „Ніве" састаўляецца пратакол з пасляконтрольнай нарады пры ўдзеле кантралёра Роберта Скварко і старшыні Праграмнай рады „Нівы" Яўгена Мірановіча. Было ў ім сцверджана, што несумленна разлічаны былі 8 задач. Праграмная рада падавала несумленныя заявы на датацыі, некаторыя задачы былі рэалізаваны пасля тэрміну, былі парушаны рэгуляроўкі закону аб рахункаводстве.

17 ліпеня 2003 г. — Беластоцкая дэлегатура НКП састаўляе пасляконтрольнае выступленне. У пяці пунктах патрабавала яна м.інш. падаць у Міністэрства культуры, Гарадскую ўправу і Маршалкоўскую ўстанову сумленныя разлікі коштаў выканання фінансавых задач з датацый атрыманых у 2001-2002 гг., рэалізаваць задачы ў тэрмінах і маштабах вызначаных у дамовах, выкарыстоўваць датацыі выключна на пакрыццё коштаў прадбачаных у дамовах і датычных выконванага пры дапамозе датацыі задання, а таксама весці рахункаводчы ўлік у адпаведнасці з законам аб рахункаводстве і дамовамі.

30 ліпеня 2003 г. — У „Кур'еры паранным" з'яўляецца першы з усяго цыкла артыкулаў Збігнева Нікітаровіча. Атрымаў ён загаловак „Przeminęło z *Niwą*" і ілюстрацыю — здымкі з папяровымі караблікамі з экземпляраў „Нівы". Аўтар аўтарытарна сцвердзіў: „НКП выявіла, што тыднёвік беззаконна выкарыстаў больш за (!) 174 тысячы датацыі з Міністэрства культуры". Артыкул пачынаўся сцвярджэннем: „Дайшлі мы да рапарту НКП, з якога вынікае, што ў 2001-2002 гадах у заявах на датацыі выдавец „Нівы" перавысіў кошты аж на 39 прац."

26 жніўня 2003 г. — Праграмная рада „Нівы" вяртае 4 тыс. зл. Міністэрству культуры. Гэта нявыкарыстаныя датацыі, назначаныя згодна з дамовай з красавіка 2001 г. Пару дзён пазней Міністэрства прымае разлікі датацыі і матэрыялы, якія датычаць мерытарычнага боку справаздач.

7 кастрычніка 2003 г. — НКП паведамляе Раённую пракуратуру Беласток-Поўдзень, што ў выніку кантролю Праграмнай рады тыднёвіка „Ніва" ў Беластоку „былі выяўлены факты, абгрунтоўваючыя падазрэнне ў здзяйсненні злачынства", якія заключаюцца ў вядзенні рахункаводчых кніг супраць правіл закону аб рахункаводстве, падаванні ў гэтых кнігах несумленных даных, а таксама адсутнасці фінансавых справаздач.

10 кастрычніка 2003 г. — Дэлегатура НКП прымае да ведама адказы на пасляконтрольнае выступленне ды тлумачэнні бухгалтаркі Марыі Паўлючук на тэму памылковага састаўляння разлікаў датацый атрыманых ад Міністэрства культуры. Адначасова дырэктар беластоцкай дэлегатуры НКП Антоні Янухта інфармуе, што гэтыя тлумачэнні яго не пераканалі. Дадае: „Да таго з перададзеных Міністэрству разлікаў датацый і тлумачэнняў вынікае, што частка датацыі выкарыстана была нязгодна з вызначэннямі дамоў, паколькі фінансаваліся імі кошты задач рэалізаваных перад дамовамі ці пасля іх тэрміну, або кошты, якія фінансаваліся з датацыі, не былі прадугледжаны дамовамі заключанымі з Міністэрствам".

20 кастрычніка 2003 г. — Надкамісар Ян Крайны з беластоцкай паліцыі пад наглядам Раённай пракуратуры Беласток-Поўдзень пачынае следства, якое ахоплівае 11 абвінавачаных сябраў Праграмнай рады. Бяруцца адпячаткі пальцаў, праводзяцца допыты, „збіраюцца" доказныя матэрыялы.

27 верасня 2004 г. — Надкамісар Ян Крайны перадае матэрыялы аб прадстаўленні абвінавачанняў адзінаццаці членам Праграмнай рады. Пазней старшыня Пракуратуры Беласток-Поўдзень Бажэна Кішло склікае спецыяльную прэс-канферэнцыю. „Хачу заявіць, што гэтая справа не мае ніякай сувязі з палітыкай", — сцвярджае. „Ніва" на гэтую прэс-канферэнцыю запрашэння не атрымала.

22 кастрычніка 2004 г. — Падазроныя і сведкі атрымліваюць павесткі на допыты ў пракуратуру.

3 снежня 2004 г. — Пракуратура дапускае доказ у якасці заключэння судовай кансультанткі Анны Андрэйчук. Сама кансультантка ў час пазнейшага працэсу прызнаецца, што ў сваёй кансультацыі адказвала выключна на пытанні пракуратуры.

26 снежня 2004 г. — На інтэрнэтавых старонках паяўляюцца каментарыі: „To sobie skurwysyny porządzili na koszt Polaków..." Публікуецца першая з заяў выказваючых неспакой, выкліканы склаўшайся вакол „Нівы" сітуацыяй у сувязі з кантролем НКП, стаўленнем паліцыі і пракуратуры да дзеянняў Праграмнай рады. Падпісалася пад ёй блізка 20 беларускіх арганізацый у Польшчы. Пасля сваю салідарнасць выказваюць беларускія арганізацыі ўсяго свету. Збігнеў Нікітаровіч у „Кур'еры паранным" падагульвае гэтую першую заяву артыкулам пад загалоўкам „Na Niwie histerii i represji".

31 снежня 2004 г. — Намеснік раённага пракурора Беласток-Поўдзень Анджэй Астапа рашае закрыць папярэдняе следства. Рассылаецца паведамленне да абвінавачаных, што абвінаваўчыя акты і заявы на ўмоўнае спыненне крымінальнага працэсу перададзены III Крымінальнаму аддзелу Раённага суда.

14 лютага 2006 г. („Валянцінкі") — У Раённым судзе пачынаецца працэс. Меў ён пачацца ў канцы студзеня, але быў адтэрмінаваны па заяве адвакацкага боку. Суддзейскаму складу старшынюе Кшыштаф Казлоўскі. Народныя засядацелі — Я. Абрамовіч і Л. Ярмоцік.

Раіна СТЭФАНЧУК

Найлепшыя бегуны

430 дзяцей з Гайнаўскага павета ўдзельнічалі ў спаборніцтвах па бегу ў Свінароях каля Нараўкі. Штогодняе мерапрыемства арганізавала Павятовае аб'яднанне ЛЗС у Гайнаўцы.

Чэмпіянат вучняў пачатковых школ і гімназій Гайнаўскага павета адбыўся 8 мая г.г. на паляне „Пад дубамі". Было таксама супольнае вогнішча, пячэнне каўбасак, гарбата. Дзеці і моладзь вельмі ахвотна прыязджаюць сюды на спаборніцтвы.

Сярод спартыўных камандаў з пачатковых школ першае месца заваявала каманда з Нарвы, другое з Кляшчэляў, трэцяе з Чаромхі, чацвёртае з Белавежы і пятае з Дубін.

Сярод гімназічных камандаў першынство заваявала каманда з Гімназіі ў Нараўцы, яна апярэдзіла сапернікаў з Нарвы, Белавежы, Чаромхі і Дубін.

З ліку наймалодшых вучаніц пачатковай школы пераможцам стала Магда Кіндзюк з Дубін, па чарзе за ёю на фінішы былі Малгажата Хілецкая з Белавежы і Юстына Спірыдовіч з Дубін. У катэгорыі IV класы і малодшыя чэмпіёнкай стала Ева Зіневіч з Кляшчэляў, другое месца заняла Магда Грынявіцкая з Кляшчэляў і трэцяе Дар'я Паўлючук з Нарвы.

Сярод вучаніц старэйшых класаў самай быстраходнай была Наталля Ялоза з Дубін, за ёй прыбеглі Наталля Шварц з Новага Корніна ды Моніка Леўчук і Магда Качук з Чаромхі.

Сярод гімназістак з I і II класаў найхутчэйшай была Уршуля Пучынская, за ёю апынуліся Эмілія Гіншт з Нараўкі і Марта Ліпінская з Кляшчэляў. Сярод старэйшых гімназістак (III клас) першае месца заваявала Іаанна Іванюк з Нарвы, а другое і трэцяе — Барбара Савіцкая і Малгажата Пучынская з Нараўкі.

У дзвюх катэгорыях наймалодшых удзельнікаў сярод юнакоў пераможцамі сталі Войцех Стыпулкоўскі і Пётр Скепка — абодва з Новага Ляўкова (Нараўчанская гміна). 1 000 метраў найхутчэй адолеў Каміль Кісель, які прыбег перад Якубам Бляшуком і Марцінам Мартыновічам (усе з ПШ у Кляшчэлях). На 1 600-метровай дыстанцыі трыумфаваў Лукаш Бэднаж з Кляшчэляў, за ім прыбеглі Міхал Герасімовіч з Чаромхі і Рафал Свяртока з Белавежы. Рафал Засім з Нараўкі найхутчэй бег на 2 000-метровай дыстанцыі. Ён апярэдзіў сваіх равеснікаў Давіда Янкоўскага і Пятра Валкавыцкага з Нараўкі.

Пераможцы атрымалі кубкі, дыпломы, кніжкі і альбомы „Белавежская пушча". Узнагароды ўручылі: Андрэй Скепка — арганізатар мерапрыемства, сакратар Павятовага аб'яднання ЛЗС у Гайнаўцы, Мікалай Павільч — войт Нараўчанскай гміны і Юры Сірак — намеснік старасты Гайнаўскага павета.

(мох)

У Гайнаўцы будзе крыты басейн

Крыты басейн для плавання будзе пабудаваны ў Гайнаўцы, каля Беларускага ліцэя. Аб'ект будзе складацца з басейна размерам 12,5 х 25 метраў з нержавеючай сталі (будзе ён другім такога роду ў Польшчы). Тут усе ахвотныя будуць мець магчымасць навучыцца плаваць.

Будзе таксама сауна і зал для практыкаванняў для здаравякаў. На басейне будзе спецыяльнае абсталяванне для стварання хваляў, гейзер ды штучная рака, з'язджальні.

(мох)

Катлы з удавіцамі

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Люба Гушч (злева) і Вольга Сіверская рады былі расказаць пра сваю вёску

З кожным годам старэюцца Катлы. У распаложанай побач Бельска-Падляшскага вёсцы жыве ажно 24 удавіцы і 2 удаўцоў, а толькі адно дзіця дабіраецца на гмінным аўтобусе ў школу. Вузкая вуліца і невялікія драўляныя хаткі паабапал дарогі ствараюць добрую нагоду вяртацца думкамі ў мінулае. Гравійная сельская дарога, якіх зараз вельмі мала ў наваколлі Бельска, можа ўзрадаваць аматараў даўніны, але хвалюе мясцовых жыхароў. Гмінныя ўлады ад многіх гадоў не могуць прыбрацца пакласці асфальтны насціл, хаця гэтую інвестыцыю падтрымліваюць не толькі мясцовыя гаспадары і пенсіянеры, але і жыхары Бельска, якія ў Катлах купілі дамы для летняга адпачынку.

Калі хачу я паставіць машыну ў цень, сочаць за мной некалькі жанчын. Рашаюся распачаць размову пра вясковыя справы.

— Добра, што вы рашыліся з намі пагаварыць, — кажуць пасля ўступнай размовы мае субяседніцы. — Маглі б вы зайсці да людзей, якія сказалі б: „Мы нічога не ведаем". Мы, наадварот, рады пагаварыць з чалавекам, які прыехаў з іншай мясцовасці.

Адна з жанчын спачатку не была ўпэўнена, ці застацца на размову.

— Калі вы сказалі, што хочаце са мной пагаварыць, я хацела вас аставіць і адысці. Думала, што вы будзеце прапаведаваць, так як тыя маладыя людзі, якія прыязджаюць да нас на веласіпедах з Бельска і нагаварваюць пераходзіць на іх веравызнанне. Калі вы сказалі, што з беларускай газеты, я рада з вамі пагаварыць, — кажа Вольга Сіверская.

— Мы аднак ведаем сваё і нас ужо не адцягнуць ад праваслаўя, — заяўляе Люба Гушч, якая запрапанавала схавацца ад ветру ў вялікіх сенях, дзе спатыкаецца са сваімі сяброўкамі-пенсіянеркамі.

Мая субяседніца пачынае расказваць пра стары дом, які быў збудаваны каля 120 гадоў назад, чаго доказам ёсць дата вырытая на драўляным матэрыяле. Аднак у Катлы хата была перавезена толькі каля шасцідзесяці гадоў назад і таму ў вёсцы ёсць многа дамоў, якія будаваліся раней.

— Зараз частка дамоў у вёсцы пустуе. Як я прыйшла замуж у Катлы 63 гады назад, было тут 120 дамоў, а зараз можа восемдзесят асталося. Маладыя сталі вучыцца і выязджаць у гарады, а старыя паміраюць. Некаторыя дамы купілі жыхары Бельска, але ёсць і такія, што пачынаюць развальвацца. Толькі цяпер у сяле ёсць 24 удавіцы і 2 удаўцоў. Мой таксама памёр 15 гадоў і пакінуў мяне адну. Добра, што зараз пенсіі даюць, то адзінокія жанчыны могуць жыць самастойна на вёсцы, — кажа Люба Гушч. — Калісь я пытала адну кабету, навошта вам выходзіць трэці раз замуж? Яна мне кажа: „Дзіцятко, а хто ж будзе араць поле і сеяць". Я падумала: і праўду яна кажа. Раней без мужчын цяжка было жыць.

Побач спадарыні Любы таксама знаходзіўся пусты дом, а панадворак зарос зеллем.

— У нас вузкія панадворкі і мне страшнавата было хадзіць побач кустоў і зелля, што расло за плотам. Гэты ўчастак купіў пенсіянер з Бельска, які перасяліўся жыць у нашу вёску. Зараз і мне стала весялей. Ён свой чалавек і ўвесь панадворак давёў да парадку і траву засеяў. Міла паглядзець, — гаворыць спадарыня Гушч і пачынае распавядаць пра сваіх дзяцей, з ліку якіх адзін працуе лекарам у Беластоку.

Зараз у Катлах гаспадарыць яшчэ каля дзесяці сямействаў. Частка асоб, пра якія гавораць мае субяседніцы, ужо пенсіянеры і дапамагаюць абрабляць поле сваім дзецям, што жывуць у гарадах. Некалькі малодшых гаспадароў разбудоўвае свае гаспадаркі. Бяруць яны ў арэнду поле ад суседзяў, або купляюць.

— Галэмбеўскі гадуе 18 кароў і абрабляе многа поля. Аднак гаспадар апошнім часам прыхварэў і дзеці мусяць спраўляцца з гаспадаркай. У Хаманюка таксама ёсць каля 10 кароў. Іншыя гаспадары гадуюць па некалькі кароў і гаспадаркі ў іх невялікія, — інфармуюць жанчыны, з якімі размаўляю.

Скупка малака ўжо даўно была зачынена і зараз спадарыня Галэмбеўская прымае малако ад вяскоўцаў у асобны ўмяшчальнік. Некалькі асоб рашылася вазіць малако ў Пасынкі, дзе сыравіну забіраў Гайнаўскі малочны кааператыў і плаціў за яе больш, чым Бельскае малочнае прадпрыемства.

— Землі ў нас рознай якасці. Калі перад вайной ліквідавалі цераспалосіцу, можна было атрымаць больш зямлі горшай якасці. На такі варыянт рашыўся мой бацька, які хацеў пасля абдзяліць полем дачок. Пасля мы дакупілі яшчэ зямлю, але знаходзілася яна далёка за вёскай, — успамінае Вольга Сіверская. Было ў яе каля 15 гектараў поля і бывала, што гадавала з мужам па 5 кароў, цялят і бычкоў. Аднак найбольшы прыбытак быў ад гадоўлі коней, бо збожжа на дрэнных землях расло ў нас невялікае.

— Трэба было многа працаваць, бо гадавалі мы дзяцей, якія пасля пайшлі вучыцца. Збудавалі мы дом у Бельску, які дачка атрымала ў пасаг. Пасля дзеці параз'язджаліся і прыйшлося аддаць поле разам з лесам за пенсію на дзяржаўную ўласнасць, — кажа спадарыня Вольга.

Мае субяседніцы добра памятаюць закалот, які спадарожнічаў арганізаванню калгаса. Дзейнічаў ён коратка, але пакінуў помнікі ў выглядзе гаспадарчых будынкаў.

— Мы не схацелі ўступаць у калгас, бо трэба было гадаваць дзяцей. Нямнога асоб уступіла ў яго і коратка ён дзейнічаў. За нашым панадворкам сталі будаваць абору і гаспадарчыя калгасныя будынкі, у якіх складвалі збожжа і гадавалі авечак. Калі калектыўнае гаспадаранне развалілася, вярнулі людзям зямлю, а мы не маглі атрымаць поля распаложанага зараз за нашым панадворкам, бо на ім стаялі будынкі. Пасля рабочыя займаліся ў гэтых будынках пляценнем вырабаў з ракіты, а цяпер жыхар Бельска разгарнуў у іх гадоўлю, — гаворыць Люба Гушч.

У Гушчоў землі былі рознай якасці. На лепшых палях расла пшаніца, а горшыя абсейвалі жытам або прызначалі на лугі.

— Сваю зямлю перапісала я на сына. На найгоршым полі мы пасадзілі лес, а лепшае поле ўзяў у арэнду сусед. Зараз частка палёў у нашай вёсцы ляжыць аблагом, а горшыя землі, распаложаны побач лясоў, зарастаюць самасейным лесам, — кажа спадарыня Люба. — Калісь мы цяжка працавалі. Зараз стала жыць лягчэй, то ўміраць трэба будзе. Яшчэ каб дажыць часоў, калі паложаць асфальт на вясковай дарозе.

Хаця ў Катлах закрылі геэсоўскую краму з-за невялікага прыбытку, у вёску прадукты давозяць ажно на трох машынах.

— Усё патрэбнае харчаванне нам прывязуць. Толькі за гарэлкай мужчыны ездзяць у Бельск. На адной машыне прыязджаюць маладыя дзяўчаты. Кажуць, што крыху апасаюцца самі ездзіць, але эканамічныя ўмовы жыцця прымушаюць брацца за мужчынскі занятак. За вёскай было месца, дзе вясной застрагалі машыны, а гэтыя дзяўчаты праязджалі там і ў дадатак на гэтай велізарнай машыне, — кажа Вольга Сіверская.

У пусцеючай вёсцы ёсць толькі адно дзіця, за якім прыязджае школьны аўтобус. Жывуць яшчэ дзве дзяўчыны, якія закончылі адукацыю і працуюць у Бельску. Сярод 4 маладых кавалераў таксама частка ўладкавалася на працу ў горадзе, а іншыя дапамагаюць бацькам.

Аляксей МАРОЗ

Агляд у Гарадку

13 гадоў таму ГП БГКТ увяло ў план сваёй штогадовай дзейнасці Агляд абрадавых калектываў як адно з мерапрыемстваў звязаных з тоеснасцю беларусаў Беласточчыны, з іх рэлігіяй, традыцыяй і прыгожымі звычаямі. Ужо ад дзесяці гадоў праводзіцца яно ў Гарадку, бо менавіта гэтая мясцовасць з'яўляецца сімвалам беларускасці, сімвалам усяго таго найлепшага, што можа спрыяць і ўмацоўваць нашу беларускую нацыянальную свядомасць.

— Мы ў змозе годна ўтрымаць і належна захоўваць нашы традыцыі і абычаі, нашу беларускую тоеснасць, — гаварыў старшыня ГП БГКТ Ян Сычэўскі, адкрываючы разам з войтам Гарадоцкай гміны Веславам Кулешам гэтую спецыфічную артыстычную ўрачыстасць. Нацыянальныя праваслаўныя звычаі асабліва адчувальныя пасля вялікіх рэлігійных свят, у тым ліку звязаных з Вялікаднем. У гэты час праваслаўныя людзі Беласточчыны вітаюцца між сабою нават не па-беларуску, а старажытнацаркоўнаславянскім прывітаннем „Христос воскресе" і адказваюць на яго „Воистину воскресе".

Цяпер, у паслявелікодныя тыдні, каб наблізіцца да існуючых звычаяў і традыцый, вядучая гэты своеасаблівы канцэрт, сакратар ГП БГКТ Валянціна Ласкевіч увайшла на сцэну і адразу прывіталася словамі „Христос воскресе" і адразу „грымнула" ёй у адказ з перапоўненай залы „Воистину воскресе". Гэтак распачаліся выступленні 14 абрадавых калектываў, якія маглі выступіць дзякуючы датацыям Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі, аб чым інфармаваў вялікі надпіс пры сцэне.

Першым выступіў дзіцячы калектыў з Самаўрадавага садка № 14 у Беластоку з абрадам „Каляды", падрыхтаваным настаўніцамі Аннай Бабік і Альжбетай Рудчук. З дзяцьмі выступалі іх бацькі. Цікавае і прыемнае было іх супольнае знаходжанне на сцэне. Асабліва чыстая і прыгожая наша родная мова ў вуснах гэтых маленькіх выканаўцаў і таленавітая супольная з дзяцьмі ігра настаўніц выклікала мілае ўражанне, нягледзячы на тое, што голас дзяцей чуваць было недастаткова. Але гэта ж дзеці. Усё гэта ім выбачальна.

Пасля была нечаканасць. Многіх прысутных да слёз узрушыў абрад „Рэкруты", у якім выступіла плакучая маці, якая адпраўляла свайго сына на многія гады ў салдаты. Роля гэтая была выкананая так праўдзіва, з мацярынскім болем і так таленавіта, што цяжка было не расхвалявацца, а нават заплакаць. Адыход у колішнія салдаты прадставіў абрадавы калектыў „Антракт" з Бельскага дома культуры. Падрыхтавала яго Альжбета Фіёнік. Яна падрыхтавала таксама навучэнцаў Бельскага беларускага ліцэя, якія паказалі колішні абрад „Вяселля" (яго першы дзень).

З „Вясельным абрадам" выступілі яшчэ „Вульчанкі" з Вулькі-Тэрахоўскай пад мастацкім кіраўніцтвам Валянціны Верамчук. „Васілёчкі" з Бельска-Падляшскага пад кірункам Ніны Бялецкай падрыхтавалі абрад „Пераможвіны", а гурт „Каліна" з Залук (Гарадоцкая гміна) пад кіраўніцтвам Валянціны Паплаўскай выступіў з абрадам „Сваты".

Абрад звязаны са „Сватамі" выканаў калектыў „Цаглінкі" са Старога Ляўкова на чале з Мікалаем Мяжэнным, а гурт „Рэчанька" з Козлік на чале з Любай Гаўрылюк паказаў як адбываліся, ды яшчэ і цяпер сям-там адбываюцца, „Адведкі".

Надзея Грушэцкая з Арэшкава са сваімі аднавяскоўцамі напомніла як святкаваліся „Рагулькі", якія песні тады спяваліся.

„Расспяваны Гарадок" з Гарадка ў звычаі „Валачобнікі" напомніў як качаліся крашаныя велікодныя яйкі і якія спяваліся, ды яшчэ спяваюцца, песні. І прыгожа заспявалі. Гэты абрад падрыхтавала Ніна Цыванюк. Таксама прыгожа заспявалі „Малінкі" з Малінік (Арлянская гміна) на чале з Верай Нічыпарук, якія прадставілі „Веснавыя вячоркі".

Выступілі яшчэ гурты „Крыніца" з Беластока з пастаноўкай „Суседзі" і самадзейнікі Вясковага дома культуры ў Рыбалах са сцэнкай „Дзявочы вечар". Беластоцкі гурт падрыхтавала Галена Арцішэўская, а рыбалаўскі — Лідзія Мартынюк.

Як апошні цікава выступіў калектыў „Асенні ліст" з Гарадка з абрадам „Вялікдзень".

Усе ўдзельнікі абрадавага агляду атрымалі рэчавыя ўзнагароды і дыпломы.

На гэтае мерапрыемства прыбылі прадстаўнікі Пасольства Рэспублікі Беларусь у Польшчы Уладзімір Чышаў і Тадэвуш Стружэцкі, прадстаўнік Міністэрства ўнутраных спраў і адміністрацыі Яраслаў Малэцкі, консул РБ у Беластоку Вадзім Палякоў і іншыя госці.

Міхась ХМЯЛЕЎСКІ

Фота ЮРКІ ХМЯЛЕЎСКАГА

Цаглінкі

Адгалоска

У 11 н-ры „Нівы" за г.г. прачытаў я допіс Уладзіміра Сідарука п.з. „У Кузаве" і вельмі мне даспадобы, што войт Чаромхаўскай гміны Міхал Врублеўскі трымаецца старых звычаяў і не траціць кантакту з жыхарамі вёсак. І гэта вельмі добра.

Былі калісьці і ў Нарваўскай гміне сустрэчы з насельніцтвам. Войтам быў тады Ян Тапалянскі, а сакратаром Мар'я Аварчук. Заўсёды ў канцы зімы або на пачатку вясны адбываліся сходы ў кожнай вёсцы, у час якіх прадстаўнік самаўрадавай улады інфармаваў аб выкананні мінулагодняга плана, дэталёва акрэсліваў яго выкананне і на якую суму грошай. Затым прадстаўляў план дзейнасці гміны на бягучы год ды ставіў жыхарам пытанні адносна таго, што яшчэ трэба зрабіць у дадзенай ваколіцы. Тады радны (ад якой мясцовасці быў выбраны) мусіў абавязова, хоць раз у год, сустрэцца са сваімі выбаршчыкамі і прадставіць ім інфармацыю аб працы Рады гміны, расказаць чым яна займалася і што было зроблена ў дадзены перыяд.

Памяняўся войт гміны і старыя звычаі адышлі ў забыццё. Цяпер у нашых вёсках, калі раз у год адбудзецца вясковы сход, дык гэта вельмі добра. Жыхары вёсак не ведаюць планаў працы Гміны, напрыклад, што было запланавана ў мінулым годзе, што зроблена, ды што плануецца на бягучы год. Як пісала „Ніва", у Кузаву на сход прыехаў войт, скарбнік гміны, паліцыянт і прадстаўнік сельскагаспадарчай службы з Гайнаўкі. На сходзе можна было свабодна выказаць свае заўвагі да гмінных улад, паліцыі і прадставіць ўсе астатнія недахопы.

Варта, каб Гмінная ўправа ў Нарве прыняла гэта ўсур'ёз да сэрца і як найхутчэй арганізавала вясковыя сходы і паінфармавала насельніцтва аб рэалізацыі мінулагодніх заданняў ды прадставіла план дзейнасці на бягучы год.

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

У Радзе Бельскага павета аб справах Беларусі

27 красавіка г.г. на сесіі Рады павета Бельск-Падляшскі радныя прынялі рэзалюцыю па парушэннях чалавечых і грамадзянскіх правоў уладамі Беларусі. Рэзалюцыю апрацавалі прадстаўнікі выбарчых камітэтаў складаючых Раду павета.

У рэзалюцыі гаворыцца м.інш.: «„Паслядоўнае і жорсткае душэнне беларускімі ўладамі ўсіх праяваў незалежнасці, дэмакратыі і грамадзянскай свабоды патрабуе ад еўрапейскай і сусветнай дэмакратычнай грамадскасці неадкладных дзеянняў дзеля прымушэння беларускіх улад шанаваць чалавечыя і грамадзянскія правы. Міжнародная грамадскасць не можа дапускаць фактаў жорсткіх разгонаў мірных шэсцяў, арыштаў дзеячаў апазіцыі і незалежных журналістаў, ліквідацыі незалежнага друку, парушання дэмакратычных выбарчых стандартаў, забароны свабоды слова, ізалявання прадстаўнікоў дэмакратычнай апазіцыі ад сродкаў масавай інфармацыі, злоўжывання дзяржаўнай уладай, праследу меншасных арганізацый, асабліва пражываючых у Беларусі яе грамадзян польскай нацыянальнасці, ды выдаляння беларускай мовы са школ і вышэйшых навучальных устаноў. (...) Ідучы за Сеймам Рэчы Паспалітай клічам: „Беларусы — суседзі і прыяцелі — мы з Вамі!"»

Міхал МІНЦЭВІЧ

Інспірацыя

Дзякуючы інспірацыі пішу чарговую карэспандэнцыю ў „Ніву". А той інспірацыяй, штуршком для пісання пэўна з'яўляецца вясна, але не толькі.

У слоўніку „Podręczny słownik polsko-białoruski" ад 1962 года слова „інспірацыя" няма. І ў скарочаным „Słowniku białorusko-polskim, polsko-białoruskim" ад 1996 года таксама няма гэтага слова. Затым не ведаю, ці магу карыстацца словам „інспірацыя", але можа будзе гэта мой уклад ва ўзбагачэнне беларускай мовы.

Цікава, што каб пісаць у „Ніву", то для таго патрэбна мне ўжо інспірацыя, хоць з другога боку, штуршком для допісаў можа быць усё: і вясна, і выбары прэзідэнта, і падслуханая размова ў мнагалюдным тралейбусе, і ціхае ды спакойнае мора або допісы ўсё ж актыўных карэспандэнтаў „Нівы" ды „Czasopisa". Калі мова пра знакамітых карэспандэнтаў „Нівы", дык не ведаю, ці яны патрабуюць якойсьці інспірацыі, каб даслаць пералітыя думкі на паперу. Ці для Уладзіміра Сідарука чыгунка і яе праблемы з'яўляюцца інспірацыяй для шматлікіх допісаў, ці проста піша ў „Ніву" без ніякай інспірацыі?! А возьмем зусім актыўнага карэспандэнта з Дубіч-Царкоўных і ваколіц. Думаю, што ён ніякай інспірацыі для пісання не патрабуе: што ў галаве, то і на паперы, і са сваімі думкамі дзеліцца ён з чытачамі „Нівы" ўжо некалькі дзесяткаў гадоў.

У чарзе шматгадовых карэспандэнтаў, якім спецыяльная інспірацыя непатрэбная, з'яўляюцца Мікалай Лук'янюк і Міхал Мінцэвіч ды журналісты — Аляксей Мароз і Аляксандр Вярбіцкі. Спакою мне не даюць допісы, рэпартажы Аляксандра Вярбіцкага. Едзе ён у забытую, гінуўшую на вачах вёску ці мястэчка і распытвае, найчасцей старажылаў, наогул пра ўсё. Як жывецца зараз, і як было калісьці. Дзеці і ўнукі павыязджалі ў гарады, наведваюць бацькоў ці дзядоў рэдка, або і наогул. Едзе наш журналіст, як чытаем, аўтобусамі, якія яшчэ кружаць па дарогах нашай усё больш пусцеючай краіны і запісвае апошнія дні існавання беларускай вёскі Усходняй Беласточчыны. Запісвае і перадае нейкую рэчаіснасць, не то што нам, чытачам „Нівы", больш за ўсё, будучым этнографам ці гісторыкам.

А цяпер чаму не даюць мне спакою ягоныя допісы, рэпартажы, рэляцыі. А таму, што робіцца так сумна на душы, што ўсё так хутка мінае і адзіным следам па мінуўшчыне застануцца артыкулы Аляксандра Вярбіцкага. То так выглядае, быццам Вярбіцкі адыходзіў апошнім з тых калісь жывучых вёсак, гасіў святло і закрываў дзверы за сабой. І малым суцяшэннем з'яўляецца інфармацыя, што дзесьці там на ўзбярэжжы Харватыі можна купіць апусцелую вёску, жыхары якой пераехалі жыць у гарады.

Меў я яшчэ пісаць пра артыкул „Zryw wolności" Юрыя Хмялеўскага, змешчаны ў „Czasopisie" з красавіка г.г. Але не ведаю, ці варта тупіць пяро. Бо, з аднаго боку, інспірацыя для пісання была, усё ж выбары прэзідэнта Беларусі, але наш журналіст гэтай інспірацыі не выкарыстаў так, як хацеў бы гэтага чытач галодны інфармацыі з першай рукі. З другога боку Ю. Хмялеўскі скампіляваў „Zryw wolności" з іншых газет, прыкрасіў гэта здымкамі са „Свабоды" і ўсё.

Міхал КУПТЭЛЬ

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Гражынка і Грак

- 25 -

На першых старонках газет паявілася сёння інфармацыя: будзе лета нялетняе, халоднае і дажджлівае. І хоць у гэты маёвы ранак ярка свяціла сонца, дзьмуў халаднаваты вецер. Фортачку пакінулі адчыненую, Грак мог спакойна вылецець на вуліцу, ды не надта цягнула яго выбрацца з цёплага зацішнага пакоя. Так яно ў жыцці бывае: найбольш смакаваў бы забаронены плод, асабліва калі пакажуць яго табе праз шыбу. А тут — ляці, калі хочаш. Хочаш вярнуцца — калі ласка, абы дарогі дамоў не забыўся. Можаш нават запрасіць каго-небудзь да сябе ў хату, неабавязкова спадара Шадара (які і незапрошаны ахвотна наведае калі не Грака, дык хоць пазнаёміцца са змесцівам суседскага халадзільніка). Можаш запрасіць нават нейкую сімпатычную грачышку-аднагодку, што летась з яйка вылупілася. Паразмаўляць, пачаставаць чымсьці. А, можа, лепш сапраўды выбрацца на вуліцу, пабачыць, што там робіцца цікавага.

Грак ускокнуў на раму фортачкі. Хіснуўся на двор, і калі адчуў, што агарнула яго халоднае паветра, аж заплюшчыў вочы і па-а-а-аляцеў! Прызямліўся на свежай маладзенькай траве. Крутануў галавой туды-сюды. Здавалася, быў у вялікім празрыстым шары, які канчаўся недзе на гарызонце і ў хмарах, а ўсё наўкола было аграмаднае — мала што дрэвы, дамы, платы, машыны, што з грукатам і шумам і мчалі па дарозе. Нават травіны былі такія вялікія! А паміж сцяблінкамі хадзілі мурашы, поўз на адной назе здаравенны слімак, а з норкі вылазіла штосьці доўгае, быццам вяроўка, гібалася, надувалася...

— Ты хто такі? — заглянуў Грак у месца, дзе павінна быць галава таго чагосьці доўгага і гнуткага. Жвавая істота, азірнуўшыся на птушку, юркнула ў пухкую чорную глебу блізкага кратавіння. — Я хачу з табой пасябраваць.

— Э-э-э, які ты дурань! — слімак наставіў рожкі ў бок Грака. — Пасябраваць з дажджавым чарвяком! З бязногім круцялём! Яшчэ і пытаецца! Еж, не пытайся. А мяне не чэпіш, у мяне дом на спіне!

І слімак падагнуў сваю слізкую ножку, схаваў рожкі і ўвесь залез у сваю хатку.

— От і пагаварыў! Ці ж я буду есці чарвяка? — здзівіўся Грак. — Здаецца, пшэнная булачка смачнейшая!..

Міра ЛУКША

„Зорка" ў роднай вёсцы

Чаму Дожджык называецца сляпым?

Жыў Дожджык і любіў ён лётаць на аблоках і хмарках. Яшчэ яму падабалася гуляць са сваімі маленькімі кроплямі.

Калі пачыналася навальніца, Дожджык дарыў свае кропелькі людзям. Але яны чамусьці хаваліся пад дахамі, уцякалі дадому.

Неўзабаве Дожджык зразумеў, што дарослыя і дзеці любяць Сонейка. Яно яркае і дорыць усім святло і цяпло. Тады Дожджык вырашыў парадаваць людзей ноччу. Але, калі ён выйшаў, на вуліцах зусім нікога не было. Дожджык не здаваўся. Ён выліў усе кропелькі ноччу, калі людзі спалі. А раніцай усе спяшаліся на працу, у школу і злавалі, што многа лужын. Дожджык пачаў плакаць і на людзей закапалі дробныя кропелькі. Дзеці і дарослыя прыкрыліся парасонамі. Тады Дожджык пайшоў да Сонца і спытаў:

— Чаму ўсе не любяць мяне?

Сонца адказала:

— Я цябе навучу. Ты выходзь тады, калі буду я свяціць.

Дождж так і зрабіў. І ўсе людзі ўзрадаваліся.

Але ад яркіх сонечных праменняў Дожджык... аслеп. З той пары такі Дожджык і называюць сляпым.

Таня КАЛІНІНА, Гродна

Маланка і Гром

У згодзе калісьці жылі Маланка і Гром.

Любіла Маланка, калі хмары ўкрывалі неба і ажно чорным рабілася ўсё навокал.

А Гром, гледзячы на яе, шчыра радаваўся. Сябраваў ён з Маланкай. Ды неяк гарачая Маланка нізка над зямлёй шуганула і зачапіла дрэва. Загарэлася яно. Маланка ўзрадавалася і давай іншыя дрэвы паліць!

Гром разгневаўся на Маланку, пачаў сварыцца на яе, каб не паліла дрэў. Але Маланка не паслухала Грому. Людзей крыўдзіць пачала, будынкі падпальваць.

І цяпер у навальніцу — толькі блісне Маланка, Гром ужо злуецца, сварыцца на яе.

Маланка яшчэ больш разыходзіцца — Гром голас павышае. І так да таго часу, пакуль не ўтаймуе ліхадзейку, пакуль не перастане сваволіць Маланка. Тады і Гром сціхае. Тут глядзіш, і дождж перастае.

А новая навальніцца пачнецца — усё паўтараецца. Кароткая памяць у Маланкі!

Юры ЯРМЫШ

Вясёлка

У версе шалік новы,
Прыгожы, каляровы,
Апусціўся ля ракі.
Пабягу я напрасткі,
Адарву яго хоць крышку,
Эх і шалік будзе мішку.

Ніна ГАЛІНОЎСКАЯ

Галерэя дэкламатараў — НАРАЎКА 2006

Аляксандра Сарокін

Габрыся Нічыпарук

Юстына Давідзюк

Лукаш Марчук

Тры Паўліны і Паўл

У класе ніхто не прадбачыў такога сцэнарыя, карацей— Марцін цалкам страціў голаў. Паўліна Б. спачатку смяялася з залётаў сябры.

— Ці будзем з сабой хадзіць? — шаптаў ён у вуха сяброўцы.

— Як напішаш смешную паштоўку то тады... пабачым? — прашаптала яна.

— Ты што — я ж не дам рады напісаць смяшней за цябе.

— А памятаеш, як я напісаў кантрольную па геаграфіі, што ўсе качаліся ад смеху?!

Гэта была шумная і дурненькая гісторыя. Марцін напісаў што *Кіліманджара* гэта не афрыканскі пік а... прэзідэнт Манголіі. Гімназісты ўміг падхапілі тэкст і распавядалі яго на перапынках, праўда, па іх версіі Манголіяй кіраваў ужо нехта свойскі — дзядзька Клім Анджара.

Закаханыя — дзіўныя людзі; адны бясконца хіхікаюць або плятуць нейкія пусцячкі, другія маўчаць як магіла і баяцца вымавіць слова. У выпадку нашых сяброў першае месца ўзялі дурненькія жарты. Яны разам сталі пісаць пажаданні і сваю паштоўку адрасавалі пляткарцы Іголцы, якая асталася ў хаце.

— *Даражэнькая мамця! Як шкада, што вас няма з намі. Нашы дзеткі разбэсціліся і іх не ўтаймаваць. Проста з глузду з'ехалі. Усе грошыкі растрацілі на марожанае. І каб вы былі з намі, успамаглі б нас залатоўкамі са свайго кашалька. Паўлік зноў закахаўся. А наш прадзед бегае на ўсе танцы і бавіць там да рання. У сувязі з апошняй навіной, мы ўвесь час пад кантролем. А ўцякалі менавіта...*

Тут належыцца сказ паяснення. Яны — значыць Марцін і Паўліна Б. — прыдумалі гульню, у якой яна была мамай, а ён — татам, іх сябры — дзеткамі або сваякамі, дваюрадным брацікамі і сёстрамі; Іголка — іх бабуляй, а апекуны — прадзедамі.

Паштоўка прымала удзел у конкурсе і заняла... першае месца.

Працяг будзе

АРАБІНКА

Пярун і Цёця

Пярун — бог нябеснага агню. Пярун, паводле ўяўлення беларусаў, велічны, статны, высокага росту з чорнымі валасамі і доўгай залатой барадою. Седзячы на вогненнай калясніцы, ён раз'язджае па небе, узброены лукам і стрэламі. Яго грымотны лук — каменны молат. Яго стрэлы — маланкі. Адным ударам свайго молата Пярун разбівае хмары. Чэрці бягуць на зямлю, але і тут даганяюць іх стрэлы Перуна. Нячысцік любіць хавацца пад дрэвы, каб схавацца ад дажджу: замест яго Пярун можа забіць чалавека. Пры громе і маланцы трэба хрысціцца і нельга хавацца пад дрэвы.

Цёця — багіня лета, жонка Перуна. Па мужу яе называюць Грамавіцаю. Цёця адрозніваецца ад Лялі, багіні вясны. Цёця ўжо не маладзенькая, зграбная, тоненькая дзяўчына, а мажная жанчына. Цёця сходзіць на зямлю, каб упрыгожыць яе зеленню і кветкамі. Беларусы ўяўлялі яе абавязкова з пладамі ў руках.

З беларускай міфалогіі

Польска-беларуская крыжаванка № 22

Запоўніце клеткі беларускімі словамі, адказы з наклееным кантрольным талонам на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку н-р 18: Гулі, пух,сход, салёны, ас, сава, сыр, сак, Лі, прапаганда, пост, сам, акно, збор, галка, яда, кладка, на, вілка, баль, раслінка, вушак, плітка, аркада. палеза, гусі, кап, ух, помысл, спор, Лі, арс, квіт, сват, ліна, цап, галка, асадка, сын, бук, арда, каша, акт, лад, лёс, нянька, нагода, шык, кут.

Узнагароды, драўляныя складанкі з жывёламі і машынамі, выйгралі: **Юстына Навіцкая, Павел Тарасевіч, Якуб Сухадола, Аня Савіцкая, Юліта Скепка** з Нараўкі, **Наталля Сцепанюк** з Беластока. Віншуем!



Вершы Віктара Шведа

Працавіты тэлевізар

Раней чамусьці з працы сёння
Вярнулася дахаты мама.
Замест вучыцца, глядзіць доня
Тэлевізійныя праграмы.

Знерваваная надта маці
Запытала доню Лізу:
— Хто найбольш працуе ў хаце?
Доня сказала: — Тэлевізар.

Рафал хоча быць жырафай

— Перашкаджаеш мне на ўроку,
Нешта балбочаш і балбочаш.
Скажы, страшэнны абібоку,
Кім у жыцці сваім быць хочаш?

Настаўніцы адказ даў Рафал:
— Да гэтага прызнацца мушу,
Хачу, вядома, быць жырафай,
Каб бацька не цягаў за вушы.

Экзамены ўскладняюць навучанне

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Бельскія (злева) і гайнаўскія белліцэісты радаваліся пасля прэзентацыі тэмаў па беларускай мове

У гэтым годзе бельскія і гайнаўскія белліцэісты на пісьмовы экзамен па беларускай мове, які ў мінулых гадах адбываўся ў пачатку матуральнага марафону, муселі чакаць ажно да 24 мая. Пісьмовыя экзамены пераплятаюцца з вуснымі экзаменамі па замежных мовах і прэзентацыямі па беларускай і польскай мовах, што адцягвае частку настаўнікаў ад працы з малодшымі вучнямі. Дырэктары Бельскага і Гайнаўскага белліцэяў Андрэй Сцепанюк і Яўген Сачко лічаць, што матуральныя экзамены, ладжаныя ў час школьнага года, ускладнілі вучобы ліцэістам першых і другіх класаў. Маюць яны рэцэпт, які можна выкарыстаць у будучыні.

Стратныя малодшыя вучні

— Толькі правядзенне прэзентацый па беларускай і польскай мовах займае ў нас каля 120 гадзін. Стараемся арганізаваць урокі з тымі педагогамі, якія свабодныя ў час матуральных экзаменаў, але цяжка пазбегнуць страт і правядзенне экзаменаў адбываецца часткова коштам дыдактычнага працэсу ў першых і другіх класах ліцэя. Я ў час матуральных экзаменаў працую ў школе па-амерыканску, па 12 гадзін у суткі, — тлумачыць дырэктар Яўген Сачко. Кажа ён, што педагогі, якія правяраюць матуральныя працы, многа гадзін у суботу і нядзелю адводзяць работам вучняў і ў панядзелак стомленыя прыходзяць на заняткі. Адзін дзень у Гайнаўскім белліцэі 17 настаўнікаў з-за матуральных экзаменаў і іншых абавязкаў не магло прыйсці на заняткі з малодшымі вучнямі.

— У некаторыя дні ў камісіях працуе больш за дзесяць настаўнікаў з нашай школы і арганізаванне працы для апошніх з'яўляецца складаным заданнем. Я вымушаны прыходзіць на працу перад шостай гадзінай раніцы, а канчаю работу каля васьмі гадзін вечара, бо ў наш ліцэй прывозяць пытанні для пісьмовых экзаменаў для ўсіх бельскіх сярэдніх школ, — заяўляе бельскі дырэктар Андрэй Сцепанюк.

Калі б закончыць вучобу ў маі...

— Калі б закончыць навучальны год у канцы мая для ўсіх вучняў сярэдніх школ і ў чэрвені заняцца матуральнымі экзаменамі, іх арганізацыя была б намнога прасцейшай, — гаворыць дырэктар Сцепанюк.

Дырэктар Гайнаўскага белліцэя ідзе ў сваіх прапановах далей.

— Я прапанаваў бы закончыць асноўную вучобу ў канцы мая для ўсіх вучняў, але пасведчанні раздаваць у другой палове чэрвеня. Вучні тады працавалі б поўнай парай да апошняга дня побыту ў школе. У чэрвені можна было б праводзіць матуральныя экзамены і экзамены для выпускнікоў гімназій і падставовых школ. Настаўнікі прыходзілі б яшчэ ў чэрвені на працу, маглі б тады займацца экзаменамі і афармляць усе школьныя справы. Можна было б таксама працаваць у апошніх тыднях з вучнямі, якія адстаюць у вучобе, — кажа Яўген Сачко.

Як ацэньваеце новыя экзамены?

У белскай і гайнаўскай школах вучні найчасцей рашаліся здаваць пісьмовыя экзамены ў пашыранай формуле, бо гэты варыянт намнога вышэй ацэньваецца ў вышэйшых навучальных установах, у час паступлення ў студэнты. Маіх суразмоўцаў папрасіў я ацаніць новыя матуральныя экзамены і іх прыдатнасць у будучыні.

— Самая ідэя ўвядзення матуральных экзаменаў паводле новых прынцыпаў добрая. Вучні вымушаны працаваць больш самастойна. На пісьмовых экзаменах так падрыхтаваныя пытанні, што ліцэісты не рыхтуюць шпаргалак, бо яны ім і не спатрэбяцца. Зараз вучні сталі ставіць на свае веды і ўмеласці. Часу на пісьмовых экзаменах так мала, што нават добры вучань не ў змозе справіцца са сваімі задачамі, перапісаць іх на шпаргалку і перадаць сябрам. Зараз матуральныя экзамены даступныя і для менш здольных вучняў, якія салідна вучыліся ў ліцэі, — тлумачыць дырэктар Яўген Сачко.

— У час новых матуральных экзаменаў вучні мусяць працаваць больш эфектыўна і звяртаць увагу на ўсе загады і патрабаванні. Бывае, што ліцэістам, якія працуюць павольна, не хапае часу справіцца з задачамі, — кажа дырэктар Андрэй Сцепанюк.

Многім сёлетнім выпускнікам ужо малавядомы старыя экзамены на атэстат сталасці, але частка вучняў цікавілася старой „матурай" і можа яе параўнаць з новай.

— Лягчэй нам паступаць у вышэйшыя ўстановы паводле цяперашніх прынцыпаў. Калі мы добра справімся з пісьмовымі матуральнымі экзаменамі, у нас ёсць большая гарантыя, што будзем прыняты ў студэнты. Раней трэба было здаваць матуральныя экзамены, а пасля другі раз змагацца з уступнымі экзаменамі ў вышэйшыя ўстановы. Можа тады былі і такія выпускнікі, якія карысталіся знаёмствам, каб паступіць у вышэйшую ўстанову. Думаю, што цяпер набор больш аб'ектыўны, — заяўляе Кацярына Комар. — Зараз небяспека ў тым, што нават вельмі добра падрыхтаваны вучань можа ў нейкім дні горш сябе адчуваць або па розных прычынах быць расхваляваным. Калі нават горш справіцца з адным экзаменам, адмоўныя паслядоўнасці могуць астацца на ўсё жыццё.

— На маю думку непатрэбныя ўсе вусныя экзамены. На вынікі па іх не глядзяць у вышэйшых навучальных установах і можна было б іх не ладзіць, — заяўляе Павел, які просіць не называць яго прозвішча.

Захаваць беларускую нацыянальнасць

Белліцэісты, якіх я сустрэў у Бельску-Падляшскім і Гайнаўцы пасля прэзентацый тэмаў па беларускай мове, былі спакойнымі і хіба задаволенымі са сваіх выступленняў. Вучні выказваліся наконт творчасці вядомых беларускіх пісьменнікаў, іх дзейнасці, расказвалі пра мясцовыя абрады, традыцыі, рэлігійныя святы і гаварылі на іншыя вольныя тэмы.

— Я ў час прэзентацыі гаварыла пра Еўфрасінню Полацкую, нябесную заступніцу Беларусі. Маладыя людзі і сёння могуць браць з яе прыклад, як з адважнай асобы, якая многа зрабіла для сваёй бацькаўшчыны. Мы павінны памятаць, што багацце, гэта не ўсё. Важнай ёсць вера ў Бога і духоўнае жыццё, якія спадарожнічалі святой Еўфрасінні, — заяўляе Марта Каптэвіч. Яе сябра Марцін Кабылінскі гаварыў пра гістарычныя сталічныя беларускія гарады. Расказваў ён пра Полацк, Навагрудак і Мінск, звяртаючы ўвагу на патрэбу ведання гісторыі свайго народа.

Мае суразмоўцы паказаліся ў гутарцы са мной людзьмі даспелымі. Патрапілі яны весці разумную дыскусію наконт сваёй нацыянальнасці, веравызнання і мясцовых традыцый, аб якіх выказваліся ў час прэзентацый.

— Я буду расказваць пра абрад вяселля, звяртаючы ўвагу на мясцовыя традыцыі і праваслаўнае веравызнанне. Нам трэба трымацца сваіх каранёў, традыцый і праваслаўнага веравызнання, у якім мы выраслі, — кажа Наталля Шарко.

— Расказваў я аб абрадах у час рэлігійных святаў. Звярнуў я ўвагу на Вялікдзень, Провады і Святую Тройцу, якія святкаваліся ў Парцаве, — гаворыць Давід Семянюк. Абрады былі ў гэтай вёсцы багатымі, але мала з іх захавалася ў сённяшнім сяле. Цяпер маладыя людзі выязджаюць з вёсак у пошуках працы, а традыцыі гінуць. Калі мы зараз апынуліся ў Еўрасаюзе, не трэба саромецца сваёй нацыянальнасці, а голасна гаварыць, што мы — беларусы.

Кася Комар заяўляе мне, што яшчэ не збіраецца выходзіць замуж і хоча працягваць адукацыю ў вышэйшай установе. Выбрала яна тэму пра вяселле, бо абрады, якія яму спадарожнічаюць, зацікавілі яе.

— Добра было б захаваць старыя звычаі, бо на сучасным этапе развіцця нашага грамадства яны занікаюць. Гіне разам з імі таксама наша культура, — гаворыць Кацярына Комар. — Трэба не забываць таксама аб сваёй беларускай мове, бо без мовы няма народа.

Марта Карвоўская гаварыла пра трагізм эпохі сталінізму ў творчасці Васіля Быкава, а іншыя мае суразмоўцы расказвалі пра заслугі Францыска Скарыны для беларускай культуры і пра культурную дзейнасць Сакрата Яновіча. Відаць было, што тэмы для прэзентацый па беларускай мове разнародныя.

Аляксей МАРОЗ

У Агульнаадукацыйным ліцэі з беларускай мовай навучання ў Бельску-Падляшскім да матуральных экзаменаў прыступіла 157 вучняў, сярод якіх было 5 выпускнікоў мінулагодніх. Найбольш бельскіх белліцэістаў выбрала пісьмовыя экзамены па ведах аб грамадстве, біялогіі і матэматыцы. У Комплексе школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Гайнаўцы да экзаменаў прыступіла 119 асоб. Найбольш ліцэістаў з гайнаўскай школы выбрала здаваць пісьмовыя экзамены па біялогіі, матэматыцы, гісторыі і геаграфіі.

Пачынаецца ўсё з ракі Нявежыс

Дзесьці ў наваколлі Марыямпаля (Marijampole) загудзела ў задняй частцы машыны.

— А ці хоць крыху разбіраешся ў гэтых справах, — спытала я Т.

— Я ж не механік, — адказала шэптам.

Праз наступныя кіламетры мы ехалі ў дрыжачай цішы, быццам нямыя. Прывід павароту ў Польшчу наклікаў чорную хмару слёз. Бо завярнуць дахаты значыла паразу, так сказаць, на ўсім фронце. Раней, каб вырвацца ў дарогу, трэба было ўгаворваць сямейку, увапхнуць пад апеку кошку Мурмурку (ванітуе ў машыне) ды адкрыцца на падарожжа, якое самое ў сабе гучала як экзальтаваны выклік. Папіць кавы ў *манаўскай* Нерынзе! Карацей, мы задумалі прагуляцца па Куршскай касе і наведаць месцы звязаныя з Томасам Манам. Гэта быў наш другі падыход у бок аўтара „Чароўнай гары". Усё гэта знаходзілася амаль пад носам (мы адправіліся з Сувальшчыны) — трыста кіламетраў ад дому (па простай лініі яшчэ бліжэй, недзе пад дзвесце, хоць тут трэба дабірацца цераз Калінінградскую вобласць, а для гэтага патрэбны візы).

Хаця пераадольванне мяжы з Літвой — як жартаўліва інфармуе адзін даведнік — сёння напамінае ўваход з вуліцы ў кіно, аднак на мяжы трэба паказаць пашпарт. Мы рашылі дабрацца ў Каўнас і пасля вандраваць паўз Нёман у мясцовасць Шылютэ, каб далей направіцца ў Клайпеду і канчаткова ў Ніду. Гэта быў стары план, які не даваў спакою ад жніўня мінулага года. Ну, так...

Аднак у апошні час з'явіўся яшчэ мацнейшы штуршок. Шэтэйны — месца нараджэння Чэслава Мілаша. Вобраз вядомы ў літаратуры як „Даліна Ісы". І на дадатак мая новая прапанова спадабалася Т.

— Я таксама думаю пра тую раку, — адказала.

На бераг Нявежыса (літаратурнай Ісы) мы рашылі завітаць ужо ў канцы, значыць, у зваротнай дарозе з Куршскай касы. І зараз, калі перспектыва вандроўкі апынулася пад пагрозай аварыі машыны, трэба было *нешта* зрабіць, нешта прыдумаць. Здаецца, дапамагла адна гісторыя, родам з праваслаўнага Падляшша.

* * *

Здарэнне датычыць агульнавядомага падляшука і яно адбылося адносна нядаўна. Толік, давайце так будзем называць галоўнага героя, вяртаўся апоўначы з Белавежы ў Бельск. Пасля вогнішча, у самавітым шампанскім настроі. Пад бокам, як вясновы жаваранак, шчабятала нарачоная, якую пасля Толік учыніў сваёй жонкай. І вось, між Гайнаўкай і Белавежай, якраз у сярэдзіне пушчы, папсаваўся яго „трабант". Толік не здзівіўся, наадварот, ён чакаў такога няшчасця, хоць яго здзяйсненне адтэрміноўваў усё на заўтра. *Каб толькі не сёння*, — думаў кожны раз, сядаючы за руль.

Свой паходжаны „трабант" набыў ён за трыста злотых, праўда, гэтая пакупка здзейснілася пад ціскам аўтарытэту — машыну прадаваў яго шэф. *Мне старому непатрэбны, а табе маладому як знайшоў!* — падмовіў. Так ці інакш „новую" машыну прывіталі на панадворку з агідай:

— Дам табе яшчэ пяцьсот злотых, толькі прыбяры мне яе з-пад хаты, — сказаў на прывітанне бацька. Але Толік паставіў на сваім, значыць, паставіў „трабант" ля акна. І дзіва, аварыі, хоць усе наўкола палохалі імі маладзёна, абыходзілі яго шырокім кругам. Гэта ў пэўным сэнсе падбадзёрыла новага ўласніка трыццацігадовага „трабанта". Спачатку выпраўляўся на ім толькі за мяжу сваёй мясціны, каб перавязаць кароў, але з часам стаў ездзіць усё далей і далей. А ўжо максімальна ягоную ўпэўненасць падмацавалі дзве паспяховыя вандроўкі ў сталіцу рэгіёна — у Беласток. Таму ў Белавежу пёрся ён без ніякай аглядкі, рыхтык як на „ягуары". І калі катастрофа здарылася якраз у найгоршым месцы і часе — як пасля сам ён гаварыў — толькі тады вярнуўся на зямлю. Значыць, спачатку заняло мову. Далейшыя падзеі ведаем дзякуючы ўспамінам нарачонай.

Толік сядзеў за рулём і так унушальна маўчаў, што страх было адазвацца. Пасля вылез з салона, абышоў машыну, пахадзіў туды-сюды. Бах-бах! — ударыў у капот. Справа выглядала больш як безнадзейнай. Па дарозе ніхто не ехаў, пад рукой не было тэлефона. Час ад часу праз дрэвы свяціліся вочы пушчанскай звярыны, якую вабіла святло. І што было рабіць? Толік вярнуўся ў машыну і моўчкі завёў рухавік. Стары „грэхат", як празывалі яго „трабант" на вуліцы дзеткі, забрынчэў і... ад'ехаў! Толік не адазваўся ўжо да самага Бельска, нават на развітанне махнуў каханай галавой, быццам конь. — *Вой, а што ты зрабіў такога?*, — пытала яна ўвесь наступны дзень і ў вачах дзяўчыны гарэла захапленне Толікам. І калі не было спакою, ён прызнаўся як на споведзі:

— От, нічога, „Ойча наш" сказаў!

* * *

Так ці інакш успамін з роднага лесу падняў наш дохлы настрой, а калі мы набліжаліся да Каўнаса, у машыне перастала выць. На аўтастрадзе панаваў ледзь прыкметны рух, толькі час ад часу мы апярэджвалі аўтафуры, якія везлі тавар у Маскву або Фінляндыю. На палях сяляне садзілі бульбу. Працавалі ўручную, цэлымі сем'ямі, з дапамогай каня і плуга. Нішто не прадказвала тут турыстычнага буму, які на час г.зв. доўгага уік-энду запанаваў у Польшчы. І слава Богу! Якраз ад таго натоўпу мы ўцякалі, рыхтык старажытныя балты перад варожай навалай з поўдня, мы таксама перліся на край тутэйшай зямелькі.

У Каўнасе мы, дарэчы, ужо традыцыйна, заблудзілі. Чамусьці замест на лакальную дарогу, якая ідзе паўз берага Нёмана, мы папалі на аўтастраду, проста ў Клайпеду. Такі паварот справы зусім не суцяшаў — наадварот. Паколькі ўжо трэці раз мы з'ехалі не там дзе трэба і перад намі слалася самая камфортная і бясплатная аўтастрада ў Літве, што набліжала нас да мэты, мы пачалі роздумы над логікай пэўных памылак. Літва — краіна шалёных кантрастаў. Правінцыя, што мяжуе з Польшчай або Беларуссю — бедная і аблезлая. Затое Вільня ці Каўнас — амаль „Еўропа". Літоўская „Еўропа" цягнецца таксама абапал аўтастрадаў. Апошняя карціна сімвалічная, самы вялікі прыбытак Літве дае транзіт. Аўтастрада тут сінонім прэстыжу і кантакту са светам. У рэстаране, што прыліпаў да самой дарогі, мы сустрэлі маладую пару, якая спраўляла вяселле. Музыка і святочныя сукенкі дружак пераклікаліся з назойлівым гулам аўтафураў і занядбаным выглядам іх кіроўцаў. У гэтым свеце — астатнія, хоць ехалі з Заходняй Еўропы, больш напаміналі аўтахтонаў, якіх сустрэнеце, ад'ехаўшы ад галоўнай дарогі.

Блытаніна і немагчымасць знайсці жаданы шлях — у нашым выпадку паўз раку Нёман — спачатку смяшыла і гнявіла, хоць, як пасля выявілася, быў тут засакрэчаны толк. Цягам наступнай гадзіны мы патрапілі у Шэтэйны. Т. нават спалохалася — чамусьці ўжо чарговы раз, калі мы блукалі ў пошуках патрэбнай ракі, патрапілі — менавіта — на след Чэслава Мілаша.

(працяг будзе)

Ганна КАНДРАЦЮК

Фота ТЭРЭЗЫ СВЯРУБСКАЙ

Фота ТЭРЭЗЫ СВЯРУБСКАЙ

Рака Нявежыс

Фота ТЭРЭЗЫ СВЯРУБСКАЙ

Шэтэйны, у старым парку Кунатаў

Усіх нас яднае наша мова. Яна закладае катэгорыі ды лад мысьленьня і сьветабачаньня нашых дзяцей...

http://dzietki.staronki.com

„Гэты праект", адрасаваны бацькам, і кранаючы рознабаковыя праблемы сямейнага жыцця, асабліва датычны наймалодшых, „быў запушчаны групай ініцыятыўных мамашак, якія сутыкнуліся з адной і той жа праблемай — як выхаваць дзіця беларусам у Беларусі. Вы завіталі на старонку, прысьвечаную выхаваньню беларускіх дзетак", — гаворыцца ва ўводных словах. З галоўнай старонкі можна падацца ў некалькіх напрамках.

Рубрыка „Як пайсьці ў садок?" запрашае і тое запрашэнне абгрунтоўвае: „Дзеля чаго патрэбны садок? У звычайных сем'ях адказ на гэтае пытаньне зразумелы: каб бацькі маглі вярнуцца да працы, а дзеці атрымалі навыкі сацыялізацыі. Нам жа, тым хто спрабуе захаваць генафонд нацыі, неабходнасьць наведваньня садочку ў двух словах не акрэсьліць". Аўтар рубрыкі піша далей: „Мае настойлівыя пошукі станоўчых аргументаў з боку вартых павагі навукоўцаў і дасьледчыкаў адносна існаваньня малога дзіцяці ў асяродзьдзі пастаяннай блытаніны блізкародных моваў ня далі плёну. У адзін голас спэцыялісты нагадваюць, што на аснове назіраньняў і аналізу гаворкі іншых людзей дзіця ў першыя тры гады не толькі пачынае пераймаць фанэтыку, граматыку і іншыя фактары правільнага маўленьня, якое потым будзе сьведчыць пра культурны ровень чалавека, але і вучыцца логіцы, закладае падмурак для будучых посьпехаў у розных відах дзейнасьці". Ёсць тут і практычныя парады бацькам, якія хочуць адстаяць беларускамоўнае выхаванне сваіх дзетак, што ва ўмовах беларускай сталіцы складана можа менш, чым у сталіцах іншых дзяржаў.

Рубрыка „Сям'я ці кар'ера" разглядае названую дылему; яна не дае гатовых адказаў, бо такіх універсаліяў няма, але варта туды заглянуць, бо тэма гэтая вельмі багатая.

Рубрыка „Рэцэпты ад Кухціка" знаёміць наведвальніка з ласункамі, якімі ахвотна пачастуюцца малечы. З гэтай рубрыкай карэспандуе і рубрыка „Знайдзі сваё свята", бо святкаванне таксама неразлучна з пачастункамі.

Рубрыка „Цяжарнасьць і роды" мае практычна-мемуарны характар. Тут і разважанні як назваць дзіця, якія вядуцца ў розных спектрах і ў рознай перспектыве.

Рубрыка „Здароўе" не з'яўляецца універсальным медыцынскім даведнікам, але кладзе націск на выбраныя, складаныя праблемы развіцця дзіцяці.

Рубрыка „Дзеткі 0-3" дае гатовы матэрыял для заняткаў з малечамі, а рубрыка „Дзеткі 3-6" дае парады на той перыяд выхавання, калі ў дзяцей наглядаецца некаторая накіраванасць зацікаўленняў.

Рубрыка „Сямейныя стасункі" разглядае спадзяванні і расчараванні той сферы сямейных адносін, якая „прымушае сэрца біцца хутчэй, узнімае крывяны ціск".

Рубрыку „Мова" характарызуе адзін з першых сказаў: „Усіх нас яднае наша мова. Яна закладае катэгорыі ды лад мысьленьня і сьветабачаньня нашых дзяцей, бо, пісьменна ўжываная, ёсьць адным з чыньнікаў паўставаньня ды замацаваньня новага дэмакратычнага кантэксту і дыскурсу, які дазволіць пачувацца нашым дзеткам сапраўднымі еўрапейцамі".

А каб даведацца больш, рэкамендую папросту наведаць сайт асабіста.

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Адразу пасля турніру пакінуў беларускую дружыну канадскі трэнер Глен Хэнлан. Цяпер амбітны коуч пастараецца дасягнуць поспеху ў НХЛ...

Беларусь, беларусы...

Блізка да „сямёркі"

70-ы чэмпіянат свету па хакеі завяршыўся пераканаўчай вікторыяй шведскай дружыны, якая ў фінале адолела Чэхію — 4:0. Упершыню ў гісторыі адна краіна ў адзін год выйграла і алімпіяду, і сусветнае першынство. Трэцяе месца засталося за іншымі скандынавамі — Фінляндыя ў змаганні за бронзу таксама з сухім лікам перамагла Канаду, якая, падобна, пасля паразы ў паўфінале, страціла матывацыю — 5:0.

Паспяховым чэмпіянат стаў і для Беларусі, якая ў неафіцыйнай класіфікацыі ўзнялася на 6-е месца. Свой галоўны матч на турніры нашы хакеісты выйгралі ў Швейцарыі — 2:1. Да гэтага апошнія пяць гульняў (у тым ліку тры афіцыйныя) беларусы швейцарцам прайгравалі. Так што рэванш быў вельмі дарэчы, ды і агульныя рахункі параўняліся. Гэтая перамога паспрыяла і славакам, якіх беларусы выцягнулі ў чвэрцьфінал на сваіх плячах. У адной восьмай давялося змагацца з Фінляндыяй, самым нязручным для нашых супернікам. Да гэтага на розных „сцяжынках" беларусы спатыкаліся з суомі 5 разоў і нязменна саступалі. Не здарылася сенсацыі і цяпер. У фінаў на гэтым чэмпіянаце была наймацнейшая абарона, зламаць якую нашым не ўдалося. У выніку атрымалася 0:3 на карысць скандынавaў.

Пасля распаду СССР і „разводу" Чэхіі і Славаччыны ў хакейным свеце сфармавалася сямёрка суперхакейных дзяржаў: Канада, ЗША, Чэхія, Славаччына, Расія, Швецыя і Фінляндыя. Пэўны час у гэтае кола імкнулася Нямеччына, але пасля рэзка „адкацілася". Апошнія гады ў лік прэтэндэнтаў у васьмёрку выразна вылучылася Швейцарыя. Цяпер „заяўку" падалі і беларусы. А чаму б і не? Змагла ж маленькая Славаччына ўзняцца да неверагодных вышынь, дасягнуўшы на планетарных пяршынствах усіх медалёў. Заканамернасць лакальнага поспеху беларусаў мусіць пацвердзіць ужо наступны чэмпіянат. Пройдзе ён у Маскве і Санкт-Пецярбургу, а супернікамі нашых у групе стануць Чэхія, ЗША і Аўстрыя.

Адразу пасля турніру пакінуў беларускую дружыну канадскі трэнер Глен Хэнлан. Цяпер амбітны коуч пастараецца дасягнуць поспеху ў НХЛ, дзе працуе з маладым перспектыўным „Вашынгтонам". Магчыма, менавіта Хэнлан, які верагодна будзе кансультантам зборнай Беларусі, параіць каго прызначыць яго пераемнікам. Можа на чале стане хтосьці з асістэнтаў — Эдуард Занкавец ці Уладзімір Цыплакоў, якія добра ведаюць англійскую мову і могуць прагрэсаваць як хакейныя спецыялісты.

Лепшымі з беларускіх хакеістаў на чэмпіянаце названыя галкіпер Андрэй Мезін (амаль усе матчы ён правёў бліскуча), форварды Сяргей Задзялёнаў і Дзмітрый Дудзік. З поўным правам у гэтую тройку маглі трапіць і нападнікі Міхаіл Грабоўскі (ён стаў самым выніковым з нашых — 9 ачкоў: 5 галоў плюс 4 галавыя перадачы і Андрэй Скабелка — таксама 9 пунктаў: 2 плюс 7). 35-гадовы Скабелка абвесціў пра завяршэнне сваіх выступаў за нацыянальную дружыну. Прытым форвард устанавіў новыя рэкорды беларускай зборнай — у 133 матчах за галоўную каманду краіны ён набраў 114 ачкоў (49 закінутых шайбаў плюс 65 пасоў). Далей слова і, можа, слава маладым...

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Паслуга за паслугу

Генадзь якімсьці сёмым пачуццём адчуваў, што сёння яго затрымаюць. І хоць нічога кепскага не збіраўся рабіць, проста разам з іншымі ў гэты дзень, дзень беларускай вайсковай славы, збіраўся ўскласці кветкі ў гонар перамогі беларускіх войскаў пад Оршай над расійскімі, а памятаў, што і раней яго затрымлівалі не за кепскае. Прадчуванні яго не падманулі. Мардаты шыракаплечы следчы, цяжка ўздыхнуўшы ад відавочнай абсурднасці і непатрэбнасці той працы, якую яму падкінулі апазіцыянеры, з дзікім нежаданнем, робячы ў некалькі разоў больш намаганняў волі, чым могуць зрабіць самыя вопытныя і спрактыкаваныя індыйскія ёгі, дастаў з паліцы бланкі пратаколаў затрымання. Нічога асабістага ў следчага да Генадзя не было. Але тупасць маючай адбыцца бяздумнай працы даводзіла яго да шалу. У дадатак ён збіраўся з сябрамі пасля працы выпіць куфаль-другі піва. А тут такі аблом. Трэба зноў займацца апазіцыянерамі. Гэтыя змешаныя пачуцці нараджалі ў ягонай душы нічым не абгрунтаваную і невытлумачальную нянавісць як да ўсёй беларускай палітычнай апазіцыі разам, так і да затрыманага сёння Генадзя асабіста.

— Як вы мяне дасталі! Як вошы лайдака, — гнеўна зіркнуўшы на Генадзя і разумеючы, што для складання пратакола ўсё адно прыйдзецца пачаць размову, ці то сцвердзіў, ці то паскардзіўся следчы. — У мяне куча нераскрытых спраў. Трэба бандытаў лавіць, зладзеяў усялякіх. А я вымушаны губляць свой час на цябе. Абрыдла гэта мне. І вы ўсе абрыдлі.

— А я што, прасіў цябе мяне затрымліваць? — спакойна адгукнуўся Генадзь. — Ідзі, лаві сваіх бандытаў. Ты ж сам зараз прызнаўся, што нявінаватага схапіў.

— Ты мяне не блытай, — следчы на некалькі таноў павысіў свой голас. — Сядзелі б сабе ў хаце і ніхто вас не чапаў бы. А так лазіце як блохі па бяззубым сабаку, толькі праблемы ствараеце. Чаго вы дамагаецеся? І што вы ўвогуле для людзей можаце зрабіць?

Генадзь зразумеў, што следчы сапраўды вельмі раззлаваны. І не толькі тым, што не можа злавіць тых бандытаў, а тым, што не ведае за што затрымаў Генадзя і як складаць цяпер пратакол. Загадалі затрымаць — затрымаў. А за што і сам не ведае. Таму, паколькі не можа знайсці юрыдычнага, то шукае хоць маральнага апраўдання сваім дзеянням.

— А чаму цябе цікавіць, што мы можам зрабіць? — павысіў голас і Генадзь. — Выкінь тое з галавы і ні ў каго больш не пытайся. Ты сляпы, як крот на сонцы, бо мы ўжо шмат зрабілі, у тым ліку і для цябе асабіста, а ты не бачыш.

— Для мяне асабіста? — усміхнуўся следчы. — Ну-ну. Можа раскажаш што. А то я сапраўды не заўважаю вашай дабраты да мяне. Прасвятлі мне розум.

— Ну, напрыклад, дзякуючы нашай працы так і не могуць нас, беларусаў, далучыць да Расіі.

— А мне то што? Мне хай далучаюць хоць да Кітая. Абы за работу плацілі. Я ў Расіі можа яшчэ больш зарабляў бы. Што за ласку вы мне зрабілі?

— Можа і зарабляў бы, да пары да часу, — цяжка ўздыхнуў Генадзь. — Але зараз цябе можа ўжо і не было б. Усе расійскія міліцыянты праз Чачню прайшлі. Ды не ўсе адтуль вярнуліся. Можа і ты сваю тупую галаву там склаў бы. Хто ведае. Хто цяпер зарабляў бы для тваіх дзяцей? Тоцкі? І мяне зараз дапытваў бы Тоцкі, а не ты. Так што я для цябе шмат зрабіў. І некалі твае дзеці мне за тое дзякуй скажуць. А вось мае дзеці табе не падзякуюць. Бо ты замест таго, каб бандытаў лавіць, мяне дахаты не пускаеш.

Следчы адклаў асадку ўбок і ўважліва паглядзеў на затрыманага. Ён сапраўды так ніколі не думаў. А тут гэты апазіцыянер сцвярджае, што зрабіў для яго такую паслугу. Гэта трэба было абдумаць. Ён дастаў з кішэні цыгарэты і выйшаў на вуліцу.

Праз нейкі час у кабінет увайшоў другі міліцыянт. Ён сказаў Генадзю забраць усе рэчы і ісці за ім.

— Ну вось, — сонна пазяхнуў ён, выйшаўшы на вуліцу. — Не ведаю, пра што вы размаўлялі са следчым, але ён загадаў адпусціць вас дахаты.

— Вельмі міла з яго боку, — узрадаваўся Генадзь. — Больш нічога не казаў?

— Казаў, што ён з вамі цяпер у разліку. І прасіў, каб больш яму не пападаліся і не дурылі галаву. У яго і без вас клопатаў вышэй страхі. Бандытаў лавіць трэба.

Генрых ЗПАДАШМЯНСКІ

Вясновыя вандроўкі

Сёлетняя зіма надакучыла не толькі фірмам ачышчаючым дарогі, але адмоўна паўплывала на стан майго здароўя. Снег, мароз ды галалёдзіца не дазвалялі нос высунуць з хаты. Заседзеўся я быццам барсук у нары, стаў больш „пухкім", пад дзесяць кілаграмаў прыбыло. Кашмар! З нецярпеннем чакаў я вясну. Рух на свежым паветры — самае лепшае лякарства на скіданне лішніх кілаграмаў. Люблю веласіпедныя вандроўкі — прыемнае з карысным. Рэабілітуеш здароўе ды ёсць нагода з людзьмі пагаварыць. Затым у мяне нарадзілася ідэя: раніцай ды адвячоркам буду прагульвацца на ровары па наваколлі. Назначыў маршрут. Аб цікавейшых падарожжах рашыў пісаць допісы.

Субота, 6 мая г.г. Надвор'е паспрыяла для падарожжа. Ранкам, хаця холадам пацягвала, але дзень прадказваўся быць сонечным ды цёплым. Гравейкай праз „Ажарова" падаюся я ў напрамку Вулькі-Тэрахоўскай. Даўней кузаўцы ездзілі гэтай дарогай на валянскія сенажаці ды пад граніцу на „Хлевісьцке" і „Тэрэхівське" (назвы ўрочышчаў ад мясцовасці Хлевішчы і Тэрахі, што за мяжою асталіся). Дарога была тады не найлепшай якасці. За „Вераском" ад „Шылаўкі" пачыналася пясчаная пустыня, а далей фурманкі гразлі ў балоце. У час дажджавога надвор'я людзі сена выносілі насілкамі. Загружанай фурай нельга было праехаць. Найгорш было каля Раманчуковага поля. Кузаўцы збудавалі грэблю. Праз дзесяцігоддзі многае перамянілася. На „Шылаўцы" водаправод праклалі. Дзе раней поле жытам ды лубінам засявалі, зараз парастае бярэзіна. Многія дзялянкі ляжаць аблогам. Сенажаці пад Вулькаю былі меліяраваны. Ды гравейка — хоць кацісь. Асфальтавай дарогай даязджаю да скрыжавання дарог на вуліцы Тапалёвай, затым падаюся ў напрамку Ставішчаў.

Вуліца апусцелая. Адно пенсіянер-чыгуначнік целяпаецца з банкай малака на пункт скупкі, па вуліцы Ланковай. Вуліца ў Ставішчах да паловы асфальтаваная, далей — брук. Чакае лепшага часу. Сядзібы задбаныя, відаць гаспадарскую руку. За вёскай кіруюся ў Полаўцы. Дарога хоць не найлепшай якасці, але праезджая. На пабочыне ў рове прыкмячаю аграмадны пень таполі, пэўна фура дроў будзе. Нікому непрыдатныя.

Фота УЛАДЗІМІРА СІДАРУКА

Дарога ў Полаўцах

Полаўцы прывіталі мяне як тры гады таму: апусцелая вуліца. Брак табліцы з назвай вёскі. Паварот на ўзгорку, каля крыжа, неабазначаны дарожным указальнікам (чытай „Праблемы адной вёскі", „Ніва" н-р 45 ад 9.11.2003 г.). Зараз за вёскай, дзе падаюся ў напрамку пагранічнага перахода Полаўцы — Пяшчатка, адрэзак пясчанай дарогі і цяжка роварам праехаць. Прыдалося б крыху жвіру, каб дарогу паправіць. Далей дарога абкапаная равамі, бярозкамі абсаджаная. Так да краёвай шашы, якая крыжуецца з чыгуначнай лініяй Чаромха — Высока-Літоўск. І тут па-даўнейшаму няма дарожнага ўказальніка. На пагранпераходзе, на польскім баку, аніводнага аўтамабіля. Адно прадаўшчыца прадуктовай крамы вядзе „жывую" гутарку з сяброўкай. На беларускім баку, дзе праходзіць пашпартна-мытны кантроль, стаіць некалькі машын. Неўзабаве паразменка.

Фота УЛАДЗІМІРА СІДАРУКА

На скрыжаванні дарог ў Полаўцах

Дамоў вяртаюся праз вёску Чаромху і чыгуначную станцыю. Праязджаю побач вясковых могільнікаў Ставішчаў і вёскі Чаромха, якія мяжуюць з шашою, затым каля каталіцка-праваслаўных могілак на „Каганцы", за сядлецкім пуцём прыналежным да Чаромхі-Станцыі. На магілах свежыя кветкі і лямпачкі. Непадалёк дарогі знаходзіцца гмінная звалка. Вароты кругласутачна адкрытыя. Вецер разносіць па навакольным лесе фольгавую ўпакоўку ды ўсялякае смецце. Працаўнікі Гмінай камунальнай гаспадаркі намагаюцца прыбіраць, але безвынікова. Пры большым ветры сітуацыя паўтараецца. Смецце валяецца на пабочыне краёвай дарогі. Сорам перад замежнымі турыстамі.

У вёсцы Чаромха мясныя крамы дрэмлюць у ранішняй цішыне. Ніводнай машыны на беларускіх нумарах. Мясцовыя чарамшане збіраюцца ў Кляшчэлі на царкоўны фэст, бо Юр'е ў мястэчку — парафіяльны „одпуст".

А ў Чаромсе-Станцыі па вуліцы 1 Мая, як заўсёды ў суботу, кірмаш. Тут можна купіць усё патрэбнае для кухні, а таксама вопратку, абутак ды гародніну. Найбольш было кветак і расады. Вядома, вясна наступіла. Дадому прыехаў я ў 7.30. Двухгадзінная вандроўка станоўча паўплывала на стан духа. Не адчуваў я стомы, хоць праехаў больш за пятнаццаць кіламетраў. Крыху адпачынку спатрэбіцца. Затым Юр'е ў сямейным крузе будзем адзначаць. Імянінніка свайго маем.

(працяг будзе)

Уладзімір СІДАРУК

Быць на радзіме

Велікоднае свята прыбліжае да сваіх родных і блізкіх. Я раніцай сеў у Ольштыне на аўтобус і прыехаў у Беласток. У Ольштыне было хмарна, а ў Беластоку сонейка, якое ўзбуйняла радасць ад сустрэчы з роднай зямелькай. Беластоцкі чыгуначны вакзал змяніўся, цяпер тут чыста, прасторна, дэталёвая інфармацыя; не тое, што калісь, калі рускія пілі гарэлку і закусвалі цыбуляй. Але паліквідаваны шматлікія цягнікі і ў Бельск паехаў я на аўтобусе.

У Бельску акуратна, чыста, дамы прыгожыя, гаспадары дбаюць пра свае панадворкі. У Ольштыне жыву ўжо дваццаць гадоў, але там чужына, няма таго, што ў Бельску і Відаве — свойскіх птушынага спеву, буслінага клёкату ці нават сабачага брэху. Калі зайшоў я дахаты ў Відаве, усё там было ў парадку, толькі электраправодная стойка крыху пахілілася, бо не было мяне два гады дома. Гэты родны куточак заўсёды мне мілы, калі спяваюць шпакі, што заклалі сваё гняздзечка ў дупле, якое паўстала ў абрэзанай галіне яблыні. З суседам Юркам паправілі стойку і франтон хаты.

У Відаве шмат хат пустуе, маладыя выязджаюць у большыя гарады, жэняцца там і астаюцца. Цяпер, калі ў краіне няма працы, маладыя сем'і выязджаюць у іншыя краіны, каб там жыць у дастатку і тужыць па родным куточку. У Відаве цяпер толькі сем гаспадароў; солтысам тут Валя Белаказовіч, якая змяніла на гэтай пасадзе свайго мужа Уладзіміра. Бельск разбудоўваецца і Відава ўжо хутка з ім злучыцца, як Студзіводы. Відава не змяняецца, ніхто тут не будуецца бо людзі не маюць працы.

У Відаве прыгожа абгарадзілі могілкі, на царкве красуюцца два купалы; службу ў царкве правіў а. Рыгор Багацэвіч. Найстарэйшай жыхаркай Відава з'яўляецца мая суседка Альжбета Белаказовіч, якой ужо дзевяноста шэсць, але мяне пазнала. Марыі Шарала дзевяноста тры гады ды больш за дзевяноста Еўдакіі Шурбак.

Вялікдзень правёў я ў гасцях у сястры Лідзіі Пятроўскай, якая жыве каля ПОМу ў Бельску; яна ўжо дажыла праўнукаў. Пасля гасцяваў я ў суседзяў Жэні і Юркі Южвінскіх; іх сын з дачкою і дзіцём у Ірландыі.

Свята хутка прамінула і трэба выязджаць у Ольштын, прыгожы горад, але гэта не Бельск, дзе родную мову чуваць на вуліцы. Да сустрэчы за год, калі дажыву.

Андрэй ГАЎРЫЛЮК

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Nakład: 1 485 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy udziale wsparcia finansowego Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Сакратар рэд.: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран-Асташэвіч.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na III kwartał 2006 r. upływa 5 czerwca 2006 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na III kwartał 2006 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,50 zł, a kwartalnie — 45,50 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą: kraje europejskie — 5,00 (kwart. — 65,00), kraje pozaeuropejskie — 5,20 (kwar. — 67,60). Pocztą priorytetową: kraje europejskie — 6,00 (kwart. 78,00), Ameryka Półn., Afryka — 6,70 (kwart. — 87,10), Ameryka Połud. i Środ., Azja — 7,80 (kwart. — 101,40), Australia — 10,00 (kwart. — 130,00). Wpłaty: Rada Programowa Tygodnika „Niwa", BPH PBK SA O/Białystok 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

„Даўціпы"

Андрэя Гаўрылюка

* * *

У кіно:

— Слухай, — шэпча жонка мужу, — гэты мужчына, што сядзіць каля мяне, гладзіць мяне па назе...

— Не хвалюйся, каханая, калі запаляць святло напэўна ад цябе адчэпіцца.

* * *

Даследаванне грамадскай думкі:

— Ці магу даведацца, — цікавіцца ў жанчыны апытальшчык, — што робіць ваш муж?

— Што робіць? Робіць тое, што яму загадаю.

* * *

— Каханы, ці ты не бачыў кніжкі „Як пражыць сто гадоў", якую я ўчора купіла?

— Бачыў і замкнуў яе ў шуфлядзе свайго працоўнага стала.

— Чаму?

— Баюся, каб не апынулася ў руках твае мацеры.

* * *

Між сяброўкамі:

— Чаму ты назвала свайго сабаку „Лайдаком"?

— Бо гэта мяне забаўляе. Калі толькі на вуліцы клікну на яго „Лайдак!", заўсёды некалькі мужчын азірнецца з перапалохам.

* * *

— Ці быў у цябе мой муж?

— Быў.

— А чаго хацеў?

— Не ведаю. Прыйшоў, выпіў са мною крыху гарэлкі, распрануў мяне, выкарыстаў, а чаго хацеў — не сказаў.

* * *

На лаўцы ў парку сядзіць пажылая пара. Пасля некалькіх хвілін ажыўленай размовы ён прапануе ёй:

— Можа пойдзем да мяне дахаты: маю цудоўную калекцыю лекаў...

* * *

— Міліцыя, ратунку! Міліцыя, мардуюць! — крычыць выхіленая з акна жанчына да праходзячага нізам патруля.

Паліцыянты не рэагуюць і праходзяць далей.

— Ты чуў, што яна крычала? — пытае адзін.

— Гэта не да нас: мы — паліцыя!

* * *

У дантыста:

— Пан доктар, мне баляць штучныя зубы, што вы мне ўставілі.

— А не гаварыў, што будуць як сапраўдныя?!

* * *

У матрыманіяльнае бюро прыходзіць кліент і прадстаўляе свае патрабаванні адносна кандыдаткі на будучую жонку:

— Павінна быць невысокая, апранацца сціпла, любіць плаваць і прабываць на свежым паветры.

Патрабаванні трапілі ў камп'ютэр, які праз хвіліну выкінуў адказ:

— Кліент павінен ажаніцца з пінгвінкай.

* * *

Размаўляюць адвакат з лекарам.

— Нашы памылкі, — кажа лекар, — часта схаваны два метры пад зямлёю.

— А нашы, — адказвае адвакат, — вісяць два метры над зямлёю.

Stowarzyszenie
Muzeum Małej Ojczyzny w Studziwodach
zaprasza na
III Międzynarodowy Festiwal Folkloru Wiosennego
TAM PO MAJOWUJ ROSI
29 maja — 4 czerwca 2006
29 maja — 1 czerwca (poniedziałek-czwartek)
Muzeum Małej Ojczyzny w Studziwodach — Bielsk Podlaski
Warsztaty śpiewu otwartym (białym) głosem
Prowadzący: Siergiej Olenkin (Ryga)
Iryna Maziuk (Mińsk)
2 czerwca (piątek)
Liceum z Białoruskim Językiem Nauczania w Bielsku Podlaskim
godz. 12.00
Występ grupy z Lisowczyc (rejon Kamieniec, Białoruś) oraz „Ilinskaja Piatnica" (Ryga), prezentacja płyty CD — nagrania z festiwalu „Tam po majowuj rosi" z lat 2004-2005
Muzeum Małej Ojczyzny w Studziwodach
godz. 16.00
Otwarcie festiwalu
Koncert zaproszonych zespołów: „Antrakt", Ryboły, grupa z Przedszkola samorządowego nr 7 w Bielsku Podlaskim, kapela ludowa z Radziwiłłówki, uczestnicy warsztatów śpiewu i tańca
godz. 17.30
Korowód ulicami dzielnicy Studziwody
godz. 19.00
Tradycyjne tańce białoruskie przy akompaniamencie muzykantów ludowych (plac przy ulicy Leśnej 13)
3 czerwca (sobota)
Muzeum Małej Ojczyzny w Studziwodach
godz. 10.00
Wesele w muzeum — obrzędowość weselna wsi Wojska i Lisowczyce k. Kamieńca (Białoruś, wschodnie Podlasze)
godz. 12.30
Prezentacja filmów dokumentalnych o tematyce etnograficznej
godz. 15.00
Koncert:
Walentyna Stepaniuk, Olga Kondratowicz, Piotr Juszkiewicz, Michał Dmitruk, Walentyna Marcinowicz, Ploski, Kożyno, Wólka Terechowska, Czeremcha, Tyniewicze, Zbucz, Czyże, Malinniki, Kuraszewo, Krzywiec, kapela ludowa z Dubin, „Żemerwa", Lisowczyce, Wojska, „Ilinskaja Piatnica"
4 czerwca (niedziela)
Muzeum Kultury Białoruskiej w Hajnówce
godz. 13.00
Występ zespołu z Lisowczyc oraz „Ilinskaja Piatnica"
godz. 16.00
Orzeszkowo k. Hajnówki
Koncert zespołów z Orzeszkowa, Lisowczyc oraz „Ilinskaja Piatnica"
Bliższe informacje pod tel.: 085-730-77-35



Адгаданка

1. цвёрды камень крышталічнай пароды, які ўжываецца для скульптурных і архітэктурных работ, 2. сімвал савецкай сельскай гаспадаркі, 3. пажыўны напітак з кабылінага малака, 4. горад на Прыпяці, цэнтр сярэдневяковага княства, 5. спорт Аляксандра Глеба.

(Ш)

Адгаданыя словы запісаць у вызначаныя дарожкі, пачынаючы ад поля з лічбай. У светлых палях атрымаецца рашэнне — фразеалагічны тэрмін.

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 16 нумара

Дула, Венецыя, агарод, рэчка, акцыя, каўнер, Сачанка, камар, доктар, цот, дзіця, пратон.

Рашэнне: **Гарэлачка не каток, сама коціцца ў раток..**

Кніжную ўзнагароду высылаем:

Мікалаю Сазановічу з Навін-Вялікіх

28.05 – 03.06

Баран (21.03. — 19.04.) Добры настрой, раўнавага. Афармляй справы, якія патрабуюць тактычнасці і дыпламатыі. Радасцю духа і прыязным стаўленнем схіліш да сябе ўсіх, хто схоча табе памагчы. Можаш пачаць рамонт кватэры або зусім змяніць яе інтэр'ер.

Бык (20.04. — 20.05.) Быкі, якіх чакаюць экзамены, змогуць справіцца з усім матэрыялам. Можаш пашукаць дадатковай працы. Выберыся з партнёрам у месцы, у якіх ніколі не былі. Магчымыя непаладкі з сябрамі, але выйдзе ўсё як трэба, бо ведаеце, што каму на пячонцы ляжыць.

Блізняты (21.05. — 21.06.) Працавіты час, але будзеш мець карысці — поўныя кішэні грошай. Можаш нават падумаць, як іх заінвеставаць! Нанава адчуеш вартасць уласнага цела. Вельмі добры настрой, урэшце не думаеш зашмат і не дзеліш волас на чатыры.

Рак (22.06. — 22.07.) Баявіты настрой, нават у гэты час, калі ты аслаблены. У рэалізацыі прафесійных мэт прыдадуцца таксама спрыт і дасціпнасць. Разлічвай на сяброў са знаку Блізнят і Льва, слухай іх каштоўных парад. Дыскусіі да белага ранняя. Лішак энергіі перакінь на спорт.

Леў (23.07. — 22.08.) Абудзіцца ў табе патрэба ангажавацца ў штосьці па самыя вушы. Пачнеш шукаць мэты, якой мог бы аддаць усё жыццё. Хтось дасць табе адрас тваёй сям'і, што жыве за мяжой; могуць цябе запрасіць на канікулы.

Дзева (23.08. — 22.09.) Лепш не будзь такая сціплая і пакажы свае козыры. Пазнаёмішся з людзьмі, якія адкрыюць у табе новыя гарызонты. Не сапернічай з каханай асобай; падтрымлівайце сябе, не крытыкуючы і не спрачаючыся, хто з вас лепшы.

Шалі (23.09. — 22.10.) Самотныя Шалі пойдуць як у дым за кімсьці, хто здасца ім прыцягальным. І добра — няма што калькуляваць; раз жывецца! Хоць аб сур'ёзных дэкларацыях лепш маўчаць. Дома дробныя рамонты. Падтрымка сябра са знаку Льва.

Скарпіён (23.10. — 21.11.) Шмат сілы, гнацца будзеш як вецер уперад; не мусіш нічым турбавацца. Дастаткова ведаць, чаго хочаш. Калі чаша горычы перальецца, зможаш страсянуць партнёрам! Тваё пачуццё гумару раззброіць нават найбольшых нудотнікаў. Не ўваходзь у надта блізкія адносіны з Дзевай.

Стралец (22.11. — 21.12.) Хопіць табе пару камплімэнтаў, каб ты ашалеў ад кахання! Не ўваходзь у дыскусіі. Пазбягай зайздрасці. Недахоп энергіі; абмяжуй усе справы, якія патрабуюць дысцыпліны і трываласці. Можаш паламацца, пакалечыцца, кантузіцца.

Казярог (22.12. — 19.01.) Новыя кантакты памогуць піхнуць наперад залежалыя праекты. Знакамітая інтэлектуальная форма. Могуць быць складанасці з грашыма, з карткай у банкамат.

Вадалей (20.01. — 18.02.) Будзеш злосны, нецярплівы, схільны да памылак. Асцерагайся не „падпасці" камусь, ад каго злежыць твая будучыня.

Рыбы (19.02. — 20.03.) Рыбы з 3-8.03. могуць быць пад уплывам Урана, які можа дыяметральна адмяніць іх жыццё. Грошай хопіць. Эфект даміно ў любоўных справах.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960

Ніва
ПРА КРЫНКІ

1848 год: „Касцюшка ў Крынках!”

У лютым 1848 года грымнула чарговая рэвалюцыя ў Парыжы і пачалася Wiosna Ludów, а ўжо ў пачатку красавіка да ўправы рускай паліцыі ў Беластоку прыляцеў конна карчмар з Крынак, Моўша Вольфавіч Герц, з даносам, што туды прыбыў „важный человек Костюк или Костюшко” і пахваляецца спаліць панскі двор палкоўніка Аляксандра фон Ліпхарта. Беластоцкі паліцмайстар Сікорскі неадкладна напісаў пра тое гродзенскаму губернатару фон дэр Ковену, ад сябе дадаўшы, што гэты Касцюшка хіба з тых „палякаў 1831 года” і што ён, паліцмайстар, ужо выступіў у паход на Крынкі з паліцэйскай камандай.

Генерал Хрыстафор Хрыстафоравіч фон дэр Ковен зацікавіўся. Што генерал Касцюшка спіць вечным сном у зямлі Швэйцарыі з 1817 года, гэта было ясна. Што разбіткі 1831 года, калі часам яшчэ здараюцца, то змучаныя, хворыя і ціхія, таксама ясна. І яшчэ больш ясна, што паліцмайстар Сікорскі не мае паняцця пра сваю і чужую гісторыю, бо ў тагачаснай Расійскай імперыі... гісторыі не вывучалі зусім, от, троху сабе пыхцеў Граноўскі з Маскоўскага універсітэта. Але ж дыму без агню не бывае, тым болей, каб жыд кінуў сваю карчму і конна паляцеў у блізкі свет ратаваць ад падпалу панскі двор і бровар, якому сам жа быў вечна вінен... І гродзенскі губернатар камандзіраваў да Крынак свайго лепшага афіцэра, штабс-капітана жандараў Няфёдава.

За два дні Няфёдаў перавярнуў уверх дном Крынкі і наваколле, апытаў „тринадцать евреев, богатых и бедных, и двадцать одного крестианина” і арыштаваў усё ж на дальнім лясным млыне Івана Касцюшку, здаравеннага дэбіла пры мяшках! Пасылалі па Касцюшку — маеце Касцюшку. Але вось другі арыштаваны, нейкі Сцяпан Анісімовіч, як на розум капітана Няфёдава, то была такая сволач, па кім даўно Сібір плакала з нецярпення...

Капітан Няфёдаў толькі позна вечарам дабраўся ў Гродна, здаў пад распіску абодвух арыштантаў у кайданах у гарнізонную турму, якая ў той час мясцілася ў казематах Старога замка, і паехаў да сябе на кватэру вячэраць і спаць, каб ранкам са свежай галавой стаць на рапарт да губернатара. Справа здавалася капітану Няфёдаву яснай і простай.

Гэты Сцяпан Анісімовіч вываліўся ў нядзелю з карчмы Мошкі Герцовіча на гексаганальны крынкаўскі пляц, учыніў несанкцыяваны мітынг і выступіў з палітычным маніфестам: па-першае, „неўзабаве трэба чакаць Касцюшку і французаў, а як прыйдуць, то мы будзем гуляць і паноў запалім”, па-другое, „не бойцеся вы гэтых рускіх уладаў, таму што Польшча тут як была, так будзе”, па-трэцяе, „неўзабаве ўсіх жыдоў будзем вешаць, але прытым суцяшаў бедных жыдоў, якіх настаўляў, што і вам лепей будзе, бо ж тады самі шынкі адчыніце, без паноў”, па-чацвёртае, „калі французы тут стануць, то ў Касцюшкі мы будзем толькі падафіцэрамі, але нашы дзеці будуць панамі, як цяперашнія паны”.

Справа слушна здавалася капітану Няфёдаву яснай і простай, але ён не ведаў, што на другі дзень губернатар убачыць... не адзін, а два рапарты ў адной і той самай справе.

Бо гэта няўдалы Касцюшка, які аказаўся Іванам, калаціўся на возе ўсю дарогу да Гродна і калаціўся цяпер на казённай саломе, а якабінец і рэспубліканец Анісімовіч і на возе дрых, як жытнёўка заліты, і на саломе выспаўся, а калі выспаўся і разабраўся, куды яго чорт ізноў занёс, то адразу сцяміў пісаць каяцца самому губернатару — і падняў ноччу такі гвалт і лямант, што разбудзіў гаспадзіна паручніка і не толькі не атрымаў ад яго ў зубы, але атрымаў... паперу, пяро, атрамант і „русского писаря”, бо ён, Анісімовіч, непісьменны па-руску.

І прызнаўся Анісімовіч, а пісаў за ім пісар усю горкую палітычную праўду — і як спойвае гэты Мошка Герцовіч „мещанов кринковских”, пакуль не запазычацца, а потым у адробкі аддае іх аканому пану Шыманскаму, і як гэты злодзей Шыманскі ганяе ноччу тых мяшчанаў красці лес у пана палкоўніка Аляксандра фон Ліпхарта, а сам пан Ліпхарт на адным падворку з броварам паставіў вінакурню, і цяпер у акцызных бочках з-пад піва прадае спірт у суседняе багатае Каралеўства Польскае праз мытную мяжу без усялякай аплаты, а што калі ён сам, Анісімовіч, тым хітрым Мошкам Герцовічам падвучаны, казаў што на яснавяльможнага пана губернатара, то гатовы хоць крывёю ўласнай за віну заплаціць ды хоць заўтра „в солдаты”. І ледзь пісар скончыў, наш непісьменны Сцяпан Анісімовіч выхапіў у пісара з рук пяро і роўненька вывеў: Stephan Anisimowicz, ну, бо наш Сцяпан быў непісьменны толькі па-руску.

Калі гродзенскі губернатар Хрыстафор Хрыстафоравіч фон дэр Ковен убачыў перад сабой, праз трыцаць гадоў па смерці, жывога і здаровага Касцюшку, ды яшчэ з ад’ютантам, і прачытаў у адной справе два рапарты, то зацікавіўся яшчэ болей... і напісаў свайму прыяцелю і начальніку, віленскаму віцэ-губернатару генералу Пятру Пятровічу Багратыёну-меншаму.

Справа аказалася даволі тонкай і далікатнай, бо гэты крынкаўскі палкоўнік Аляксандр фон Ліпхарт са сваім Новаладанескім пяхотным палком, з аднаго боку, служыў пад началам непасрэдна генерала Багратыёна-меншага, а з другога боку, ужо год быў пад фінансавай рэвізіяй ваеннага міністэрства са сталічнага і далёкага Санкт-Пецярбурга.

Але генерал Пётр Багратыён-меншы аказаўся не горшы стратэг і тактык, чым яго вялікі продак, пагромца Напалеона ў 1812 годзе, і распарадзіўся наступным чынам: першае, ціхага і слязлівага Касцюшку адаслаць назад на падкрынкаўскі млын да любімых мяшкоў, другое, народнага трыбуна Анісімовіча ні ў Сібір, ні Ліпхарту не аддаваць, а запіхнуць яго, „с-сукина сына вплоть до особого распоряжения!” — на год, толькі на год! — скажам, у Пружанскі павет, ага, няхай памахае сякерай у Вечнай Пушчы, паваліць лес векавы на вечную цытадэль у Брэсце-над-Бугам, і па такой рэзалюцыі тое „/Секретное/ ДЕЛО н-р 42 по рапорту Гродненского Земского Исправника о крестианине местечка Кринки Степане Анисимовиче, произносившем неблаговременный разговор о вольных воинах Костюшки” закрыць, закрыць з Богам!

Так выйшлі з вады сухімі правыя і вінаватыя, а крайнім ізноў аказаўся жыд, альбо Мошка Герцовіч — або не трэба бегаць конна з даносамі ў беластоцкую паліцыю...

У тым самым 1848 годзе, калі паявіўся ў Крынках „маніфест Анісімовіча” („мы будзем падафіцэрамі, а нашы дзеці будуць панамі”), быў надрукаваны ў Еўропе „Камуністычны Маніфест” К. Маркса і Ф. Энгельса, і пры ўсёй павазе да класікаў, пра Беларусь і беларусаў не яны бачылі будучыню, але Сцяпан Анісімовіч. Бо не было тут ні фабрыкаў, ні капіталістаў, і ніхто не браў да галавы, ці ёсць рэспубліканскія правы і свабоды, ды навошта яны, трэба пралетарыяту спачатку дэмакратыю, каб дайсці да ўлады, а потым дыктатура, каб сабе на шыю пасадзіць тую самую ўладу, альбо не трэба дэмакратыі.

Тут было так, што ўлада царская і руская, што пан з аканомам то паляк з немцам, ці наадварот, што ў карчме, краме і паўсюдна ў гешэфтах жыд, а наш Сцяпан ніхто і другі раз ніхто, але на ўсіх робіць ды ўсіх корміць... І быў толькі той спосаб разбіць гэты ланцуг, як у Анісімовіча, а не як у Маркса, Энгельса і іншых рэвалюцыянераў. Бо зямны лад і парадак адвечны, бедныя і багатыя, вольныя і нявольныя, паны і мужыкі былі і будуць — і трэба неяк выбівацца ў людзі з таго ладу і парадку, які цяпер і тут... і якога ні ты сам, ні ўсе Крынкі разам не пераменяць.

А для таго спачатку... мае прыйсці вайна, каб чыё-небудзь войска выкінула тую ўладу, якая на баку паноў і жыдоў, па чым учыняем панскія і жыдоўскія пагромы, а раз новая ўлада сама з намі без нас не справіцца, то ў якога-небудзь Касцюшкі мы будзем падафіцэрамі, бо ці ж можна хацець усяго адразу, але з часам усё ізноў усталюецца так, як было, і ўжо на нашым падафіцэрстве дзеці будуць панамі — як цяперашнія.

„Маніфест Анісімовіча” быў утопіяй толькі ў часе самога Анісімовіча і яго паншчыннага пакалення,

[працяг ☞ II]

Рэвалюцыя 1905 года

9 студзеня 1905 года гвардыя і паліцыя расстралялі ў Санкт-Пецярбургу па плошчы пад Зімовым Палацам... праўрадавую дэманстрацыю рабочых пад началам праваслаўнага святара Гапона. 14 студзеня 1905 года ў мястэчку Крынкі Гродзенскага павета і губерні паявіліся „воззвания" (ulotki) на рускай (!) мове за подпісам... „Главная Управа Социал-Демократии Королевства Польского и Литвы", якія заклікалі на другі дзень выйсці на дэманстрацыю памяці 15-годдзя смерці на шыбеніцы „четырёх героев Партии 1886 года" (L. Waryński і яго калегі з варшаўскай групы сацыялістаў Proletariat), якія першымі пацярпелі за ідэю свабоды рабочых.

15 і 16 студзеня Крынкі патрулявалі „ўзмоцненыя патрулі паліцыі", а менавіта — „становой пристав" (dzielnicowy) Жалязоўскі і чатырох „городовых" (posterunkowych), Маргоўнік-Носке, Геніуш, Калакоўскі, Мацапура... і ніякіх дэманстрацый у Крынках не было. Але 17 студзеня спачатку праз кірмаш пракацілася чутка пра „ўсеагульны страйк у Беластоку", а днём па гарбарнях паявіліся „стороннія людзі", сярод якіх Жалязоўскі і яго людзі пазналі двух — Антон Невель і Браніслаў Хін — і закрычалі „кідай работу!". Тыя „стороннія людзі" прыехалі з боку Беластока і бегалі па Крынках з рэвальверамі ў руках.

Пад сінагогай сабралася да 500 чалавек, „христиан и евреев". Той жа Браніслаў Хін і нейкія Бах ды Іван Лукіч „входили на возвышение и на идиш произносили речи о жестокости властей с требованиями уничтожить правительство"... забіць (!) паліцэйскіх, а потым усім ісці „грабить помещиков", якіх у Крынках 1905 года... ужо не было — дзесяць гадоў назад апошнія банкроты прадалі двор у казну, а зямлю гродзенскім жыдам, якія аддавалі яе ў арэнду.

Над натоўпам паявіліся два чырвоныя транспаранты з надпісамі па-руску „Долой Самодержавие!" і „Да здравствует Революция!". На мітынгу напераменку гаварылі больш дзесяці чалавек... і ўсе на ідыш.

„Пристав" Жалязоўскі пабег на тэлеграф далажыць начальству, але тэлеграфны апарат маўчаў — потым высветлілася, што парушана сувязь, спілаваныя два слупы на лініі на Ваўкавыск, тры на Саколку etc. Жалязоўскі і чатырох паліцэйскіх вярнуліся на плошчу, да іх выскачыла наперад „человек пятьдесят", пачалі шпурляць камяні... і страляць з рэвальвераў. Перад уцёкамі паліцэйскія паспелі заўважыць, што да натоўпу рабочых далучаюцца маладыя людзі са стрэльбамі, сякерамі, жалезнымі прутамі. „Пристав" Жалязоўскі адабраў у крайняй хаце каня і пагнаў у Саколку, дзе стаяў „железнодорожный батальон" рускай арміі.

Каля 2 тысяч чалавек рушылі з Базарнай плошчы на паштова-тэлеграфную станцыю, выламалі дзверы, разбілі два тэлеграфныя апараты, павыкідалі ў вокны шафы, сталы і крэслы, партрэты цароў Аляксандра III і Мікалая II пачапілі на плот і расстралялі з рэвальвераў, а потым спалілі. У начальніка пошты Аляксеева, тэлеграфіста Розенгагена і паштальёна Баравіка з нажом ля горла патрабавалі грошы. Забралі шаблю ад мундура (два рэвальверы і 3,5 тыс. рублёў „казённых денег" і паштовых пераводаў Аляксееў паспеў... схаваць у печку). Пагром скончыўся, калі „трёх молодых евреев с оружием" селі на казённую паштовую скрыню і заявілі ўсім астатнім, што да грошай далезеце... „только через наш труп", маўляў, тут шмат хто чакае грашовых пераводаў ад сваякоў на заробках у Нямеччыне і „гэта нашы грошы, а не царскія". Тым часам рэвалюцыянеры... разрабавалі кватэру Аляксеева і рушылі далей.

З плошчы пайшлі за мястэчка, „в прилегающее бывшее имение Кринки", дзе месцілася „становая квартира" паліцэйскага прыстава Жалязоўскага, там забралі ў жонкі і брата прыстава паляўнічую стрэльбу, боты, вопратку, „50 руб. казённых і 300 руб. собственных денег". Там жа разгромлена была „Мещан-

[працяг ☞ I]

бо ўсё геніяльнае і простае спаўняецца не адразу. Больш таго — гісторыя павярнулася так нечакана, як прысніцца не магла самому Анісімовічу. Якія там яшчэ падафіцэры! Як усё роўна за трыста гадоў (!) папярэдняй дэградацыі, нечуваны сацыяльны аванс адшпіліла Гісторыя беларусам...

Вялікая вайна 1914-1945 гадоў змяла Расійскую імперыю, і хоць рускую царскую ўладу змяніла ўлада руская і савецкая, але зніклі дзве адвечныя дамінуючыя на Беларусі нацыі, жыды і палякі, а ў тым Савецкім Саюзе паўстала аўтаномная Беларуская ССР — і савецкая ўлада ў ёй была не руская, а рускамоўная, якую паціху-патроху на 80% абселі ўжо рускамоўныя „беларускія паны і падафіцэры". Сацыяльны аванс у савецкай імперыі ішоў на рускай мове. Вось і ўся прычына „дэнацыяналізацыі" і „русіфікацыі".

„Халодная вайна" 1945-1991 гадоў прынесла той Беларускай ССР, коштам усяго (!) Савецкага Саюза... і яго замежных крэдыторaў ды інвестараў, самую хуткую ў часе і татальную ва ўсёй савецкай імперыі індустрыялізацыю і урбанізацыю, на грунце якіх Рэспубліка Беларусь існуе пятнаццаць гадоў (!) пасля ўпадку ў 1991 годзе „адзінага і непарушнага" Савецкага Саюза.

У беларусаў атрымалася не „па Марксу" і не „па Веберу", але „па Анісімовічу з Крынак 1848 года", таму што ажно да 1914 года беларусы былі не еўрапейскай нацыяй з уласнай элітай эпохі капіталізму, але еўрапейскім вясковым этнасам без уласнай эліты... страчанай як „наша польская шляхта" яшчэ ў XVII стагоддзі.

Геніі з вялікіх нацый, як Маркс і Вебер, ніколі не цікавіліся „малымі народамі Еўропы", як беларусы. Геніі ўважалі, што „ўсе народы (вялікія) ідуць адным шляхам", альбо кругом мае быць глабальны прагрэс, а хто „ідзе не такім шляхам"... таго вялікія народы растопчуць нагамі, і гэта таксама будзе „прагрэс". Альбо яшчэ іначай — глабалізм XXI стагоддзя гэта пакаёвае суіснаванне „старых імперыялізмаў" XIX-XX стст. А хто з тым не згодны, таго растопчуць нагамі, бо такі „непазбежны закон прагрэсу".

Такія нечаканыя высновы з правінцыйнай архіўнай гісторыі сярэдзіны XIX стагоддзя прыйшлі да мяне не адразу, а праз расчараванне — бо пасля маіх настойлівых аповедаў пра „маніфест Анісімовіча" самым розным і вельмі разумным людзям, беларускім патрыётам з гуманітарным ухілам, літаратарам, гісторыкам (!), сацыёлагам і палітыкам. З пакойнага Анісімовіча смяяліся горш, чым з мяне жывога. А я слухаў і спамінаў Гогаля: „Над кем смеётесь?! Над собой смеётесь..." Бо ўсе вы, насмешнікі, тыя „паны", хто „дзеці падафіцэраў". Якая тут шляхта ў каго ў каранях, якое мяшчанства да ліха! Ну, хіба чыйго прадзеда багатая жыдоўка-арандатарка падабрала... Беларусы гэта вясковая нацыя па сацыяльным авансе ў першым ці другім пакаленні. Так у самой Рэспубліцы Беларусь, так у Польшчы і Літве, так нават на дыяспары за вялікай Салёнай Вадой.

А цяпер вернемся ў Крынкі 1848 года, бо тады засталіся дзве загадкі, на якія няма адказу ў архівах. Першае. Адкуль народны трыбун Анісімовіч і яго калегі з партыйнай кнайпы, без газетаў, тэлеграфа і нават паравоза ці паштовага тракта, толькі праз месяц (!) ведалі пра рэвалюцыю ў Парыжы і „чакалі французаў", на чале з Касцюшкам — як „наша польская шляхта" чакала Напалеона?! Ну, былі ў Крынках жыды-балаголы і кантрабандысты, але ж яны сягялі не далей Сувалак, Пінска і Драгічына-над-Бугам... Другое. У якой такой „церковно-приходской", kościelnej ці „польскай падпольнай школцы" той Анісімовіч навучыўся так спраўна пісаць, як каліграф — бо блізка не было ў Крынках ні адной, ні другой, ні трэцяй?! Пан Аляксандр фон Ліпхарт і яго пані Марыя фон Дзіваў былі „больше русские, чем сами русские"... і такімі ж „русскими", як паны, былі польскі аканом пан Шыманскі і „прыдворныя" жыды з корчмаў і броваpaў; тая Polska ўпала ў 1795 годзе, паўстагоддзя прайшло, для мужыка тое самае, што вечнасць; уніяцкага „польскага" айца дзесяць гадоў як выгналі і прыслалі „рускага" праваслаўнага; беластоцкі паліцмайстар не ведае, хто такі Касцюшка, а гэты Анісімовіч піша па-польску і агітуе: „Не бойцеся! Польшча тут як была, так будзе"?!

Мы забылі, што як няма „адзінай" нацыі, а ёсць „просты люд" і ёсць „эліта", гэтаксама няма „адзінай" сацыяльнай супольнасці, а як ёсць эліта ў шляхты, у мяшчанскай інтэлігенцыі, у гандляроў і рамеснікаў, так ёсць „свая эліта ў простага люду". Больш таго — калі „просты люд беларускі" не меў у XIX ст. свае беларускай шляхты і беларускага месца, а „наша польская шлята" і жыдоўскае мястэчка былі яму чужыя і варожыя, то нейкая дамарослая і наіўная, але „свая эліта" сярод таго „простага люду" не магла не паўстаць.

Калі ж хто ў сумневе, што такі Анісімовіч быў увогуле, то прыязджайце ў Нацыянальны архіў Беларусі ў Гродне, дзе захоўваецца гэтая неверагодная гісторыя.

Алесь ЧОБАТ

ў нашых Крынках

ская Управа” (urząd gminy) і пабіты стараста Раутбарт, які не аддаў ключоў ад сталоў і шафаў. Потым, ужо пад вечар, тыя самыя „человек пятьдесят” вярнуліся ў Крынкі і разграмілі „Волостное Правление” (jeszcze raz urząd gminy, tylko chłopskiej i chrześcijańskiej, nie żydowsko-mieszczańskiej społeczności) да голых сценаў, забралі 600 рублёў „мужыцкіх грошай”. Потым уварваліся... у „народное училище” па-суседску, вынеслі і спалілі царскія партрэты — больш ва ўстанове асветы не было чаго браць. Беднасць.

Нарэшце, „в сумерках” дачакалася свае пагромнай калейкі „казённая винная лавка” (дзіва яшчэ, што не з выпіўкі пачалі!) — зламалі дзверы з вуліцы і падворка, „разбивали ящики и уносили вино”. Прадавец Андрэй Эйхарт, немец-лютэранін, грошы даўно схаваў і для маскіроўкі... пакінуў у касе каля 10 руб. дробнымі, але „товару вынесли почти на 900 рублей”. Толькі пасля выпіўкі ўспомнілі пра „квартиру жандара Володковского”, які з ранку... уцёк да сваякоў на хутар — там забралі мундур, шаблю і царскі партрэт. Прыслуга, Антаніна Гайдук з Саколкі, з рэвальверам у руках закрыла сабой жонку жандара і не дала ні рэчаў, ні грошай. На тым быў канец першага дня рэвалюцыі, і ўсю ноч моладзь у Крынках святкавала перамогу над старым і гнілым царскім рэжымам...

18 студзеня 1905 года быў другі дзень „крынкаўскай рэвалюцыі” — цяпер старой улады не засталося, пайшлі рэвалюцыянеры адбіраць зброю... „у местных и окрестных жителей”: паліцэйскага Лебедзя, фельчара Шалешчыка, падаткавых інспектараў Давідовіча і Сіўко, падаткавага кантралёра Петракоўскага, а яшчэ ў Міхнюка, Улянінскага, айца Пранеўскага, ксяндза Балабана, арганіста Кафарскага, аптэкара Кісялеўскага, „арандатара маёнтку” Лямніцкага... Адзін ксёндз сам выйшаў на падворак і аддаў свой рэвальвер (!), але ў касцёл і плябанію нікога не пусціў, а ўсіх вышэйпералічаных... „не было дома”, і за іх адгаворваліся жонкі, цешчы і служанкі.

Тым часам батальён з Саколкі прыстава Жалязоўскага не паслухаў і нідзе не рушыў, і прыстаў толькі тэлеграфаваў у Беласток, адкуль на другі дзень пяшком (!) ляніва выправілі... „двадцать человек команды под началом подпоручика Георгия Плакиди”, менш чынам ужо не было каго пасылаць. Гэтая каманда днём даплялася да Крынак... і адзін раз стрэліла ў паветра над крайняй хатай з дваццаці вінтовак. Рэвалюцыянеры зніклі, чатырох паліцэйскіх і Жалязоўскі ажылі, як з-пад зямлі, і ўзяліся за следства, сведкаў, пацярпелых etc, etc.

Гарачы грэк з Адэсы падпаручнік Георгій Плакідзі, хоць і даў пераначаваць людзям, але на другі дзень 19 студзеня 1905 года, рушыў на Крушыняны, куды адступілі рэвалюцыянеры — там была не горшая „казённая винная лавка”, чым у Крынках. На трэці дзень і пасля другога „гарэлачнага” пагрому рэвалюцыянеры нават абстралялі Плакідзі, і прыйшлося таму бегаць па Крушынянах і падымаць прыкладамі сонных па гулянцы абарыгенаў для адсылкі начальству. Бо ў Крушынянах „вынесли винного товару”... на 3 тысячы рублёў, альбо тройчы больш, чым у Крынках. На тым найбуйнейшая ў Гродзенскай губерні рэвалюцыя 1905 года ў асноўным скончылася.

Следства вёў той самы „пристав” Жалязоўскі — другія рускія паліцэйскія былі занятыя. Нікога ён не арыштаваў, бо ад падпаручніка Плакідзі ўсе паўцякалі, але за паўгода выціснуў са сведкаў не так мала імёнаў... Пакажам іх чытачу — Край мае ведаць сваіх „герояў”. У дужках за прозвішчам — год нараджэння і месца паходжання, і яшчэ адно „царская статыстыка” дзяліла „тутэйшых” на „мещан” і „крестьян”, жыдоў і нежыдоў. Спіс „пристава” Жалязоўскага быў такі:

„Мещане”: Юльян Цюхій (Гродна, 21), Герш Губінскі (Крынкі,19), Іосель і Шахно Бэркелі (16, 17), Шлома-Злата Вайнер (Гарадок, 21), Лайзар Гардон (Брэст, 17), Пінхус Грацанскі (Ашмяны, 17), Браніслаў Хін (Варшава, 21), Адольф Фандра (Крынкі, 24).

„Крестьяне”: (з Крынак і наваколля) Балтазар Бах (35), Генрых Будроўскі (16), Вінцэнт Дзядзель (20), Юры Раймунд (37), Канстанцін Міхайлаў (19), Восіп Якаўлеў (26), Юры, Канстанцін і Восіп Калінскія, Кузьма Сямёнаў (22), Сцяпан Лукашэвіч (30), Балтазар Місюкевіч (19), Аляксандр Пацэвіч (27), Амільян Пухальскі (17), Павел Царэвіч (17);

Андрэй (24), Эдуард (24), Браніслаў (24), Вінцук (25), Іван (25) Бахі;

Міхал Клімук (18), Ігнат Печка (21), Уладыслаў Руткоўскі (25), Аляксандр Сіпко (26), Сцяпан Чарнецкі (22), Міхал Курцэвіч (26), Іван Шымук (18), Антон Невель (21), Макс Рагачоўскі (21), Платон Кетурка (32), Андрэй Носка (38), Станіслаў Кішкель (21), Антон Стоцкі (39), Віктар Руль (21).

Але пакуль Жалязоўскі цягнуў сваё следства, прыйшла восень — і 17 кастрычніка 1905 года быў „царскі маніфест” пра дэмакратычныя рэформы, а праз чатыры дні поўная амністыя, пад якую падпалі ўсе „крынкаўскія рэвалюцыянеры”, ужо паняволеныя і яшчэ на свабодзе...

Толькі з усталяваннем у Расіі прэм’ера Сталыпіна „крынкаўская справа” трапіла ў Віленскі Акруговы Суд, дзе разбіралася з красавіка 1908 па студзень 1909 года. Віленскія газеты пералічвалі абвінавачаных: Бахі, Будроўскі, Вайнер — па алфавіту, а не па важнасці — так, як пракурор пералічваў... Пад суд паставілі ўсяго разам 45 чалавек, прыцягнулі 71 сведку, у другім часе і месцы то была б сенсацыя, але цяпер і тут... рэвалюцыя так усім надакучыла, што суд апраўдваў, каго толькі мог. Тым болей, што ні сведкаў, ні падсудных не было на месцы паловы; скажам, падпаручнік Плакідзі даўно звольніўся са службы і вярнуўся ў родную Адэсу... А вось дзе былі ў час працесу ў Вільні найважнейшыя абвінавачаныя:

Шлома-Злата Вайнер у Мінскай турме, Аляксандр Казлоўскі ў Гродзенскай турме, Сцяпан Лукашэвіч, Макс Рагачоўскі, Антон Невель, Іосель Бэркель, Адольф Фандра ў Гродзенскай турме, Амільян Пухальскі „в каторжных работах”, а Браніслаў Хін... у Віленскай псіхіятрычнай лячэбніцы. Але другія абвінавачаныя ў пагроме Крынак зімой 1905 года былі зусім у іншых месцах і не падлягалі суду (!), таму што:

Юльян Цюхай — юнкер Цвярскога Кавалерыйскага Імператарскага вучылішча, Балтазар Місюкевіч — „фельдфебель 17-го Гренадерского Самогитского полка в Москве”, Канстанцін Калінскі — „фельдфебель 144-го пехотнога Кащирского полка в Брянске”, Герш Губінскі — „канонир 6-ой батареи 2-ой Восточно-Сибирской бригады”, Іосель Беркевіч — „1-я батарэя 2-ой Резервной артиллерийской бригады в Серпухове Московской губернии”... Альбо ўсе пагромцы недатыкальныя. Бо вайсковыя цывільнаму суду не падлягалі. Дваццаць чалавек суд апраўдаў адразу. Астатніх абвінавацілі па двух пунктах: а) „вооружённое восстание”, б) „участие в восстании без организации оного”. Суд палічыў, што дзевяць чалавек „виновные” і яшчэ пяць „менее виновные”. Скончылася на тым, што Лукашэвіч і Рагачоўскі атрымалі па 2,5 гады зняволення, Фандра, Бах і Калінскі — па 2 гады, Бэркель, Невель, Вайнер, Дзядзель — па 1,5 года, другі Бах і другі Калінскі, Курцэвіч, Руткоўскі — па 6 месяцаў і Шымук 3 месяцы. Віленскі Аругоўы Суд, гледзячы на яго прысуд, сам заблытаўся і замучыўся з той рэвалюцыяй у Крынках 1905 года і думаў толькі пра тое, як скончыць тую заблытаную справу...

Расійская імперская адміністрацыя была бездапаможнай (!) супраць тэрарыстаў, пагромцаў і грабежнікаў яшчэ з 1905 года, і як „антынародны і таталітарны” царскі рэжым прастаяў яшчэ дванаццаць гадоў — не зусім зразумела. Хіба з прычыны слабізны і бяздарнай арганізацыі саміх палітычных партый... Расійская дзяржаўная ўлада, таксама судовая, была спаралізаваная крымінальным тэрорам. Мы прызвычаеныя падручнікамі і мемуарамі, што ў тагачаснай Расіі былі сацыял-дэмакраты („бальшавікі” і „меншавікі”), былі сацыялісты-рэвалюцыянеры („правыя эсэры”, „левыя эсэры”, „трудавікі”) і былі „партии национальных окраин” (Bund, PPS, Дашнакцютун etc.) — і калі гэтыя партыі мелі свае баявыя групы, то займаліся альбо нападамі на банкі і паштовыя вагоны, як бальшавікі і PPS, альбо забойствамі губернатараў, міністраў і генералаў, як эсэры Савінкаў ці Спірыдонава. А быў яшчэ „народны тэрор”, так званыя „анархісты” і „сацыялісты-максімалісты”, і быў гэты застрашальны тэрор скіраваны супраць сярэдніх і дробных уласнікаў ды супраць ніжэйшых правінцыйных дзяржаўных служачых. З адных пагрозамі выціскалі грошы, другія (паліцыя, суд etc.) мелі „нічога не рабіць і нічога не бачыць” — і ні памешчыкі, ні гандляры, ні шэраговыя паліцэйскія (!), ні правінцыйныя суддзі (!!) не мелі ніякай абароны ад „вышэйшага начальства”, якое пільнавала выключна сябе.

„Крынкаўскі пагром” 1905 года і камедыя ў Віленскім Акруговым Судзе гэта самыя тыповыя прыклады часоў гнення рускага царызму, на змену якому прыйшла бальшавіцкая дыктатура... з тых самых грабежнікаў і пагромцаў 1905 года.

Крынкі былі тым толькі „выключэннем”, што вызначыліся першымі як у „пяці беларускіх”, так „трынаццаці польскіх” тагачасных губернях Расійскай імперыі, а прыкладаў такіх шмат, і тут пераказаная толькі адна такая справа з Нацыянальнага архіва Беларусі ў Гродне.

Алесь ЧОБАТ

Сёння на Крынкаўскай зямлі

Аўтобус заязджае на прыпынак у Крынкі, у машыну забіраецца шмат — у тамашнім маштабе — народу. У сённяшнім мястэчку, якое з'яўляецца наследнікам вялікага калісь горада, рэлікт гарадскога мінулага — базар. Усе новыя пасажыры, „труженики села", валакуць галоўным чынам саджанцы памідораў. Прадстаўляюць яны сабой свайго роду разрэз тамашняга вясковага насельніцтва — гэта моцна ўжо пажылыя людзі з выразнай жаночай дамінантай. Гутараць пра надзённічыну: садзяць толькі агароды, бо на палях ураджаі збірае лясная звярына: алені, ласі, дзікі. Калісь, калі быў пэгеэр, капытныя харчаваліся на кошт дзяржавы. Зачапляюць па-свойму і шафёра, які — відаць — тамашняга хову. Але ён — гарадскі, гаворыць толькі па-польску; не на тое ж ён вырваўся ў гарадскія паны, каб гаварыць па-мужыцку. Людзі невялікімі групкамі пакідаюць аўтобус: хто ў Белагорцах, хто ў Крушынянах, хто ў Саннікох. Пад Шацілы, апрача мяне, даязджае двух мужыкоў.

Некалькі гадоў раней у Шацілах быў буфет і я заходжу ў вёску, каб купіць нейкі напой на дарогу. Але ад буфета і след прапаў; вяртаюся назад і кіруюся ў Нетупу. З левага боку дарогі, ад Шаціл да Нетупы, вялікі штучны стаў з выспай; участак абгароджаны, за брамай каплічка з фігуркай нейкага святога, на беразе байкаваты дашок змацаваны на разгалінаваным бервяне.

У Нетупе пуставата, многа тут пустых пляцоў. Калісь была тут жывая вёска, была тут школа, якую наведвалі дзеці не толькі з Шаціл і Нетупы, але з Ляшчан і Грыбоўшчыны, Саннік і Юзэфова... На адным з першых панадворкаў жанчына зграбае смецце. Зрокам шукаю салтысоўскай шыльды, але не ўдаецца мне яе знайсці. За адным з платоў сядзіць змучаная ці то гадамі, ці то вясковым жыццём жанчына; прысядаю да яе. Хачу яе крыху распытаць пра ейную вёску. На супрацьлеглым панадворку ходзіць некалькі авечак, мая суразмоўніца заўважае, што нядаўна з тае хаты вывозілі пакойніка. Пытаю, ці хто ў вёсцы трымае кароў. Так, многа кароў трымае ейны сын і яшчэ адна баба адну карову.

— Ад сына малако забірае цыстэрна? — пытаю.

— Забірае.

— У Саколку?

— У Саколку.

Заўважаю, што гутарка з незнаёмым ёй нявыгадная, а мо і самое жыццё ёй апастылела. Цікаўлюся, мо яна чакае аўтакрамы.

— Чакаю; і нявестка, і суседка таксама.

— А дзе ж яны? — здзіўляюся.

— У аўтакраме.

І паказвае мне самаход, што стаіць побач на вуліцы. Здзіўляюся, бо ж бачыў я шмат аб'язных крамаў, але да іх заўсёды збягаўся натоўп народу, а прадавец з адкрытых дзвярэй прадаваў тавар. А тут — ні духу! Развітваюся з бабулькай і іду пабачыць тую асаблівасць. А крама акуратная, у ёй, як у стацыянарнай: пасярэдзіне прылавак, за прылаўкам прадавец, перад прылаўкам пакупнікі. Нямнога іх: старэйшая жанчына, малодшая з двойкай дашкольных дзяцей; са мною, пятым, робіцца цеснавата.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Муры двара ў Жылічах

Калісь, калі людзі жылі на вёсках, было ў іх многа дзяцей, а цяпер, калі перасяліліся ў гарады, тых дзяцей стала меншаць. Глянуўшы на дзетак, што былі ў краме, я, здаецца, разгадаў вытокі таго нашага дэмаграфічнага сакрэта. У гарадах дзеці жывуць у чысценькіх кватэрах і, па сутнасці, не маюць дзе добра ўмурзацца. А на вёсцы поўна ўсялякіх фарбаў, ад якіх дзеці становяцца саматужнымі творамі мастацтва, якія куды больш чым гарадскія развесяляюць жыццё не толькі сваім бацькам. А ўсялякі жыццёвы ўздым пачынаецца, здаецца, з добрага настрою... Каб у гэтым месцы не крывадумнічаць, засцерагаюся, што згадваемыя мною дзеткі былі дагледжаны акуратна, але ў вёсцы складана зрабіць гэта на гарадскі лад.

Выйшаўшы з машыны азіраюся. З аборы, што на панадворку маёй нядаўняй суразмоўніцы, мужчына ручнымі віламі накідае гной на раскідальнік. За яром карова з ялаўкай, падняўшы хвасты, распрастаюць косці. Іду далей і пачынаю трывожыцца, ці каго яшчэ спаткаю. Як старажытнагрэчаскі Дыяген шукаю чалавека, толькі ў адрозненне ад славутага цыніка не ў духовай іпастасі толькі ў звычайнай, цялеснай. З-за апошняй хаты чую шорах, заглядаю. На парозе сядзіць мужчына каля трыццаткі, заводжу з ім гутарку.

У Нетупе жыве яшчэ васемнаццаць душ, двух гаспадароў займаецца сельскагаспадарчай вытворчасцю. Той, што трымае авечак, збожжавытворца, абрабляе палі, што ў напрамку Саннік. А згаданы пастаўшчык малака трымае за дваццаць кароў; ягоныя пашы таксама ў бок Саннік. А палеткі, што асталіся на поўдзень ад Нетупы, абрабляюць гаспадары з Шаціл. А стаў каля Шаціл выкапаў выхадзец з тае вёскі, які перасяліўся ў Крынкі.

І насупраць хаты майго суразмоўцы невялікі стаў. У апошнюю зіму марозы тут даходзілі — паводле яго — да трыццаці чатырох градусаў і ён не змог рабіць у лёдзе прадух. Пілаваў ён палонкі нават мотапілой, але зараз за ёй лёд зноў замярзаў; за зіму задушылася ў яго звыш пяцідзесяці кілаграмаў рыб.

Пытаю пра памінальны помнік, што на адным з пустых ужо панадворкаў з боку Шаціл; ён па гаспадары, што трагічна загінуў. Ёсць у Нетупе яшчэ адзін помнік, пасярэдзіне вёскі; пра яго я даведаўся раней. Недзе паўвека таму раўнівы муж забіў жонку і пакончыў з сабою, пакідаючы сіротамі маленькіх дзетак. Сіроткам бракавала бацькоў і з тае тугі, вырасшы, паставілі ім, так бяздумна іх пакінуўшым, той помнік.

Фота АЛЯКСАНДРА ВЯРБІЦКАГА

Цюмічы

З захаду Нетупу абнімае лес; на карце праз той лес пазначана дарога ў Цюмічы, але на месцы я яе не знаходжу і іду па той, якая ёсць. Даходжу жвіроўкай пад Ляшчаны і толькі адтуль паварочваю ў лясную дарожку направа. Калі лес расступаецца, на полі паказваецца самотная чорная карова з апалымі бакамі. Далей, каля крайняга панадворка, пасецца кабыла з жарабяткам, за імі паказваецца мужчына; спяшаю да яго, бо здаецца мне, што там людзі становяцца ўжо рарытэтам.

У Цюмічах жыве яшчэ шаснаццаць душ. Гаспадарку абрабляе толькі сын майго суразмоўцы, трымае сем кароў, малако ад іх возіць у Кундзічы; у вёсцы яшчэ адна жанчына трымае адну карову. Больш дабытку няма на чым трымаць — няма балаціны, навокал груды; няма нават дзе сеянкі пасеяць. Калісь у Цюмічах было за дваццаць гаспадароў, якія трымалі каля сямідзесяці кароў. Калі цікаўлюся, дзе ім знаходзілі пашу, адказвае, што выпускалі ў балоцісты лес, што ад ракі Нетупы, але тая паша слабая была і мала было малака. І навакольныя грудкі, што цяпер абраслі лесам, абраблялі гаспадары; было ў вёсцы пад трыццаць коней. Цяпер у Цюмічах трое коней. Кабыла майго суразмоўцы цяжкай сакольскай пароды і зноў жаробная; гаспадар вадзіў яе да жарабца ў Крынках.

Згадваю пра аднаго знаёмага з суседняй вёскі, які пару гадоў таму памёр.

— А так, — кажа мой субяседнік, — пайшоў ён сечку рэзаць і павіс на сячкарні; так яго і знайшлі. А на днях быў я на паховінах у Міхалове: чалавек яшчэ ў нядзелю ў царкве быў, а ў панядзелак рана стаў апранаць нагавіцы, адну нагу ўлажыў у калошу, а другой ужо не ўспеў...

— Калісь — прадаўжае — навакольныя вёскі былі людныя, напрыклад, у Крушынянах было сто восемдзесят пяць гаспадароў, а цяпер бадай хіба толькі двух абрабляе зямлю. Шмат людзей пасля вайны выехала за ўсходнюю мяжу. І наша сям'я запісалася, але раздумаліся мы. А сястра, што жыла ў Гаркавічах, не ведала пра гэта і паехала. У Юраўлянах жылі адны праваслаўныя і іх саветы насільна перасялілі да сябе; асталіся там адно пустыя хаты і ў іх пасяліліся каталіцкія рэпатрыянты. Першыя саветы вывозілі ў ссылку паноў. З Горкі вывезлі панскую сям'ю, але пасля вайны некаторыя вярнуліся. І з маёнтка ў Жылічах вывезлі пана, які ўжо не вярнуўся. Ад таго маёнтка асталіся адно каменныя сцены і паркавыя дрэвы; нядаўна той двор нехта купіў.

Мой суразмоўца горача рэкамендуе мне пабачыць рэшткі згаданага двара; урочышча Жылічы каля кіламетра ад Цюміч. Не выпадае адмаўляць добраму чалавеку і я падпарадкоўваю свой маршрут ягоным указанням. У каменных сценах жыліцкага двара няма ўжо паноў, у навакольных вёсках меншае мужыкоў і мо праз нейкі час на гэтай зямельцы збудуцца летуценныя мары ідэолагаў бясклясавага грамадства.

Аляксандр ВЯРБІЦКІ